Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 239 (28097) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Законы ў даступнай форме**

СТАР.4



**Клімавіцкая «кунсткамера»**

СТАР. 5

Сямейная газета



**Замуж за рыцара**

# ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ, ВЯЛІКІЯ РЭЗЕРВЫ

## Беларусь разглядае В'етнам як аднаго з найважнейшых партнёраў у Паўднёва-Усходняй Азіі

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на перагаворах з Прэзідэнтам В'етнама Чыонг Тан Шангам, перадае карэспандэнт БЕЛТА. «Мы ганарымся тым, што нашы адносіны выходзяць на новы ўзровень глыбокага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — сказаў беларускі лідар. Як і В'етнам, Беларусь праводзіць сацыяльна арыентаваную палітыку, накіраваную на павышэнне якасці жыцця людзей. Пазіцыі дзвюх краін абсалютна супадаюць па большасці пытанняў міжнароднага парадку дня. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што ў дзвюх краін ёсць вялікія рэзервы для далейшага развіцця адносін.**

Перш за ўсё, гэта датычыцца гандлёва-эканамічнай сферы. Аляксандр Лукашэнка не першы раз ужо знаходзіцца ў В'етнаме. «І я не пазнаю наш В'етнам. Ён мяняецца на вачах. І мы рады за вас. І мяне не пакідае пачуццё таго, што я прыехаў на родную зямлю», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Як адзначыў Прэзідэнт В'етнама, Беларусь паслядоўна прадаўжае свой шлях развіцця. «Я цвёрда ўпэўнены, што беларускі народ пад вашым кіраўніцтвам будзе дасягаць новых поспехаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, што дапаможа палепшыць жыццё людзей і павысіць пазіцыю Беларусі ў Еўропе і на міжнароднай арэне», — лічыць Чыонг Тан Шанг.

«В'етнам — наш стратэгічны партнёр, — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. — В'етнам з'яўляецца нашым надзейным сябрам у Паўднёва-Усходняй Азіі, калі хочаце — плацдармам, з якога мы гатовы супрацоўнічаць з іншымі дзяржавамі рэгіёна». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прэзідэнты грунтоўна і дэталёва абмеркавалі ўвесь спектр пытанняў беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва.

Ён канстатаваў адсутнасць рознагалоссяў паміж Беларуссю і В'етнамам як па пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва, так і па міжнародным парадку дня. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што краіны супрацоўнічаюць у ААН, Руху недалучэння і па самых злабадзённых пытаннях. «Мы заўсёды падтрымлівалі адзін аднаго і ў далейшым будзем дзейнічаць у такім рэжыме», — сказаў беларускі лідар.

Бакі актыўна падтрымліваюць міжурадавыя і міжпарламенцкія кантакты. Кіраўнік беларускай дзяржавы пагадзіўся са сваім калегам аб неабходнасці павялічыць абмен дэлегацыямі на розных узроўнях з тым, каб супрацоўніцтва паміж краінамі выходзіла на больш высокі ўзровень. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што Беларусі і В'етнаму трэба паглыбляць гуманітарнае супрацоўніцтва, адносіны ў сферы культуры, адукацыі, спорту. На яго думку, у краін існуюць вялікія рэзервы для міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь прапануе В'етнаму актывізаваць супрацоўніцтва ў нафтахіміі і свой удзел у разведцы і здабычы карысных выкапняў. Беларускі Прэзідэнт звярнуў увагу, што ўзровень тавараабароту паміж дзвюма краінамі ў памеры $190 млн недастаткова высокі, калі ўлічваць патэнцыялы Беларусі і В'етнама.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Чыонг Тан Шанг у час падпісання дакументаў па выніках перагавораў.

■ Кадравае пытанне

# ПАТРАБУЮЦЦА ЛІДАРЫ...

## ЦІ ЗАЦІКАЎЛЕНА МОЛАДЗЬ У КАР'ЕРНЫМ РОСЦЕ?

**«Падрыхтаваць добрага кіраўніка школы, каледжа і, асабліва, ВНУ — задача складаная. І тыя, хто жадаў бы ўзначаліць калектыў, павінны валодаць не толькі выбітнымі прафесійнымі якасцямі, але і арганізатарскімі навыкамі і лідарскімі задаткамі. Шчыра кажучы, нам бы вельмі хацелася, каб выбар кіраўніка адбываўся з некалькіх кандыдатур. А ў нас пакуль што з розных (як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных) прычын у сістэме адукацыі назіраецца пэўны кадравы голад», — такую думку выказаў міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ на пасяджэнні Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па рэалізацыі і ўдасканаленні маладзёжнай кадравай палітыкі.**

Амаль 20 гадоў таму ў Беларусі быў створаны Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, а таксама Спецыяльны фонд па падтрымцы таленавітай моладзі. Першы «банк» курыруе Міністэрства адукацыі, а другі — Міністэрства культуры.

— Па стане на канец лістапада ў нашым банку ўтрымліваліся звесткі пра 584 прадстаўнікоў таленавітай моладзі. 130 з іх працуюць ва ўстановах культуры, 5 чалавек — не па профілі і 379 навучаюцца ва ўстановах адукацыі сферы культуры, — паведаміў **намеснік міністра культуры Васіль ЧЭРНІК.** — Акрамя банка, у нас ёсць яшчэ і яго архіў, куды занесены звесткі пра 1772 прадстаўнікоў таленавітай моладзі. За апошнія тры гады ўзнагародамі і заахвочваннямі спецыяльнага фонду былі адзначаны 354 прадстаўнікі моладзі і 39 калектываў мастацкай творчасці. Але кадравыя праблемы актуальныя і для сферы культуры: ёсць праблемы з пошукам кандыдатаў на ролю кіраўнікоў дзіцячых школ мастацтваў, творчых калектываў і гэтак далей.

**Начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ** пацікавілася ў прадстаўніка сферы культуры: «А ці можа таленавіты ў пэўнай галіне малады чалавек стаць такім жа таленавітым і перспектыўным кіраўніком?»

— Сапраўды, акрамя мастацкай адоранасці, павінна прысутнічаць яшчэ і лідарская, — пагадзіўся Васіль Чэрнік. — Таленавіты скрыпач, напрыклад, хоча іграць на скрыпцы, выязджаць за мяжу, удзельнічаць у шматлікіх міжнародных конкурсах, стаць салістам сімфанічнага аркестра. А кар'ера кіраўніка яго не цікавіць. Людзі мастацтва ўвогуле мала задумваюцца пра тое, каб стаць кіраўнікамі...

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра гандлю:**

*«З 1 студзеня 2016 года індывідуальныя прадпрымальнікі будуць вымушаны працаваць па новых правілах: спыняецца гандаль рэшткамі — таварамі лёгкай прамысловасці, увезенымі ў Беларусь без суправаджальных дакументаў да 1 ліпеня 2014 года. Акрамя таго, з гэтай даты тавары легпрама павінны ў поўнай меры адпавядаць тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці». Таксама ўсе індывідуальныя прадпрымальнікі ў Мінску і гарадах абласнога і раённага падпарадкавання ў сваіх гандлёвых аб'ектах абавязаны ўсталяваць і выкарыстоўваць плацежныя тэрміналы, прымаць аплату банкаўскімі карткамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18259,00 | ▼ |
| Еўра | 19936,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 264,07 | ▲ |
| Укр. грыўня | 799,08 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ, ВЯЛІКІЯ РЭЗЕРВЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Беларускі лідар адзначыў, што ў час гэтага візіту падпісаны ўжо шэраг кантрактаў, якія будуць садзейнічаць нарошчванню аб'ёму ўзаемнага гандлю.

Прэзідэнт Беларусі пагадзіўся са сваім в'етнамскім калегам, што неабходна павышаць узровень міжурадавай камісіі, каб у бліжэйшыя два гады тавараабарот паміж краінамі дасягнуў і перасягнуў $0,5 млрд. Беларускі бок прапанаваў актывізаваць супрацоўніцтва ў сферы нафтахіміі, аўтамабілебудавання, па лініі сумесных зборачных вытворчасцей у В'етнаме. На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, для гэтага створана добрая аснова, падпісаны двухбаковыя дакументы, пагадненне аб зоне свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і В'етнамам.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова ўдзельнічаць у разведцы і здабычы карысных выкапняў у В'етнаме і пастаўляць для гэтага неабходнае абсталяванне і тэхніку. Акрамя таго, на перагаворах размова ішла аб магчымасцях больш шырокай падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі В'етнама ў ВНУ Беларусі. «Мы будзем рабіць усё магчымае, каб традыцыйна падтрымліваць узровень адукацыі ў В'етнаме, навучаючы ў нашых ВНУ будучых вучоных, фізікаў, IT-спецыялістаў і іншых», — запэўніў беларускі лідар. Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, бакі вялікую ўвагу ўдзялілі пытанням абароны і бяспекі. «Мы абсалютна падтрымліваем думку аб паглыбленні гэтага супрацоўніцтва. Забаронных тэм у адносінах па лініі ВПК няма, і мы будзем прытрымлівацца гэтай пазіцыі ў далейшым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь і В'етнам падпісалі праграму супрацоўніцтва ў эканамічнай, навуковай, адукацыйнай і культурнай сферах на перыяд 2016—2018 гадоў. Падпісанне дакумента адбылося ў прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін Аляксандра Лукашэнкі і Чыонг Тан Шанга. Па выніках перагавораў прэзідэнты Беларусі і В'етнама прынялі сумесную заяву аб умацаванні і ўсебаковым развіцці адносін паміж краінамі. Шэраг дакументаў падпісаны на міжведамасным узроўні. У прыватнасці, пагадненне аб навучанні грамадзян В'етнама ў ВНУ Беларусі, дарожная карта развіцця супрацоўніцтва паміж акадэміямі навук дзвюх краін, план супрацоўніцтва ў сферы турызму на 2016—2018 гады. Акрамя таго, падпісаны мемарандум і план развіцця супрацоўніцтва паміж Віцебскай вобласцю і правінцыяй Бінь Тхуан.

Учора ж Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчы са старшынёй Нацыянальнага сходу В'етнама Нгуен Шынь Хунгам і прэм'ер-міністрам гэтай краіны Нгуен Тан Зунгам. Кіраўніцтва В'етнама высока ацаніла ўзровень супрацоўніцтва паміж Беларуссю і В'етнамам і выказала ўпэўненасць, што гэты візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў В'етнам і вынікі перагавораў на найвышэйшым узроўні нададуць новы імпульс развіццю двухбаковых адносін. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што Беларусь і В'етнам могуць значна дадаць у гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, калі рэалізуюць усе дамоўленасці, дасягнутыя ў гэтыя дні бакамі.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўсклаў вянок да Манумента Загінулым Героям. Манумент узведзены ў 1995 годзе і з'яўляецца нацыянальным мемарыялам у гонар воінаў-герояў, якія аддалі свае жыцці за незалежнасць В'етнама ва ўсіх узброеных канфліктах. Помнік з'яўляецца традыцыйным месцам ускладання вянкоў кіраўнікамі афіцыйных замежных дэлегацый. Аляксандр Лукашэнка таксама ўсклаў вянок да Маўзалея Хо Шы Міна — першага Прэзідэнта Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Маўзалей размешчаны на самай вялікай у В'етнаме плошчы Ба Дзінь. Тут у 1945 годзе Хо Шы Мін зачытаў Дэкларацыю незалежнасці В'етнама. Маўзалей вышынёй 21 м падзелены на тры ўзроўні. Першы ўзровень выкарыстоўваецца як прэзідыум пры правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў. На другім узроўні, у цэнтральнай частцы Маўзалея, выкананай у выглядзе пакоя, спачывае цела правадыра.

Учора ж завяршыўся дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам. Кіраўнік беларускай дзяржавы накіраваўся ў Ашхабад, дзе будзе знаходзіцца з афіцыйным візітам да 12 снежня. Прэзідэнт Беларусі правядзе перамовы з кіраўніком Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым, па выніках якіх будзе падпісаны шэраг міжнародных дакументаў.

■ Парламенцкі дзённік

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:**

## «ЗАМОЎЧВАЦЬ НЕДАХОПЫ НЕЛЬГА»

**Адным з важных прынцыпаў у працы парламентарыяў павінна стаць галоснасць і аб'ектыўнасць. Так лічыць Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Пра гэта ён сказаў на пачатку чарговага пасяджэння верхняй палаты парламента.**

### ДЛЯ КОЖНАЙ ПРАБЛЕМЫ ЁСЦЬ РАШЭННЕ

«Зразумела, што ў сельскагаспадарчых арганізацыях і на прамысловых прадпрыемствах становішча складанае. Таму замоўчваць недахопы нельга, паколькі гэта толькі пагоршыць справы», — заявіў Міхаіл Мяснікові. На яго думку, парламенцкія групы мусяць быць у курсе спраў на кожным прадпрыемстве, каб ведаць, што ўсе магчымыя меры прыняты і ці не патрэбна ўмяшанне на ўзроўні кіраўніцтва вобласці ці адпаведнага міністэрства. Старшыня Савета Рэспублікі прапанаваў звяртацца непасрэдна да яго, калі іншым чынам вырашыць праблемы не атрымаецца.

Спікер заклікаў сенатараў шчыльней працаваць з мясцовымі ўладамі, агучваць набалелыя праблемы, садзейнічаць бізнесу і стварэнню новых вытворчасцей. Ён нагадаў нядаўнюю нараду Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аб праектах прагнозу, бюджэту і грашова-крэдытнай палітыкі на 2016 год і акрэсліў асноўныя напрамкі працы парламентарыяў у гэтай галіне.

— З вашым удзелам рэгіянальным уладам давядзецца прыняць неабходныя рашэнні па ўмовах працы ў 2016 годзе і давесці паказчыкі і прагнозы бюджэту да ўсіх зацікаўленых, — сказаў Міхалаіл Мяснікові. — Пракантралюйце, каб арганізацыі прынялі ўласныя рашэнні. Гэта неабходна зрабіць у сувязі з напружанай сітуацыяй не толькі ў нашай эканоміцы, але і ў галоўных гандлёвых партнёраў Беларусі.

За дзесяць месяцаў мінулага года колькасць занятых грамадзян знізілася на 59 тысяч чалавек. «Неабходна ствараць новыя вытворчасці, аказваць садзеянне малому і сярэдняму бізнесу, які атрымае развіццё, як вобразна сказаў наш Прэзідэнт, «калі яму не перашкаджаць». Выкарыстоўвайце магчымасці Еўразійскага банка развіцця, які на выгадных умовах аказвае крэдытную падтрымку прадпрымальніцтву», — прапанаваў спікер.

### ЛЕС, РУБЛІ І АДУКАЦЫЯ Ў КІТАІ

Члены Савета Рэспублікі прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2015 г. №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)». Па словах **Тараса НАДОЛЬНАГА, першага намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі,** такая мера пойдзе на карысць беларускім банкаўскім структурам:

— Сёння банкі прадастаўляюць даволі доўгія крэдыты, не маючы дастатковых і адэкватных па тэрмінах рэсурсаў у сваёй пасіўнай частцы. Каб гэтую сітуацыю нівеліраваць і даць банкам магчымасць мець устойлівыя пасівы, прадугледжваецца ўвядзенне ў рамках дэкрэта №7 дэпазітаў безадзыўных і адзыўных.

Таксама сенатары ўхвалілі праект Ляснога кодэкса Рэспублікі Беларусь. Мінулы раз заканадаўства ў гэтай сферы змянялі ў 2000 годзе, і таму ўнесеныя карэкціроўкі — неабходнасць часу і вынік развіцця «лясной» галіны. Парламентарыі ўхвалілі і праект закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Кітайскай Народнай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі».

**Вераніка ПУСТАВІТ**

# ПАТРАБУЮЦЦА ЛІДАРЫ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Намеснік міністра культуры таксама звярнуў увагу на неабходнасць стварэння і развіцця «сацыяльных ліфтаў» — падтрымкі і суправаджэння таленавітай моладзі з малых гарадоў і сельскай мясцовасці.

Увогуле, калі праблема з кіраўніцкімі кадрамі востра стаіць нават у буйных гарадах, то для сельскай мясцовасці, дзе выпускнікі ВНУ не затрымліваюцца, яна актуальная ўдвая. Таму асаблівая ўвага на дзяржаўным узроўні надаецца апошнім часам пашырэнню мэтавай падрыхтоўкі. У 2009 годзе яе ўмовы былі перагледжаны: узамен на прывілеі, якія гарантуюцца абітурыентам на ўваходзе ў ВНУ, за маладымі людзьмі быў замацаваны абавязак адпрацаваць у пэўнай сельскагаспадарчай арганізацыі на працягу пяці гадоў. Першы выпуск адбыўся год таму, і паказчыкі замацавання кадраў у сельскагаспадарчых арганізацыях адразу палепшыліся. Так, калі ў 2014 годзе пасля абавязковых двух гадоў адпрацоўкі па размеркаванні працягвалі працаваць 49% спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, то ў 2015 годзе — ужо 52%.

— Яшчэ падчас вучобы ў ВНУ праводзіцца праца па выяўленні маладых людзей з арганізатарскімі здольнасцямі. І найбольш перспектыўным студэнтам, якія валодаюць патрэбнымі лідарскімі якасцямі, на 4—5-х курсах прапануецца дадатковае навучанне па кіраўніцкай спецыяльнасці, — расказаў **начальнік упраўлення адукацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Алег КАСЯНЮК.** — Да таго ж на базе 57 перадавых гаспадарак вядзецца практычнае навучанне кандыдатаў на пасаду кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый: два тыдні кандыдаты праходзяць тэарэтычную падрыхтоўку ў БДАТУ, а потым месяц стажыруюцца ў кіраўнікоў найлепшых гаспадарак. На дадзены момант 95 кандыдатаў ужо прайшлі такое навучанне, з іх 14 прызначаны на кіраўніцкія пасады.

**Прарэктар па агульных пытаннях Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Максім БОРД** праінфармаваў удзельнікаў рэспубліканскага каардынацыйнага савета пра адзіны перспектыўны кадравы рэзерв, створаны ў краіне: у яго па стане на 1 красавіка ўваходзілі 1658 чалавек.

Міністр адукацыі канстатаваў, што інфармацыя пра спецыялістаў, якія павысілі кваліфікацыю або атрымалі дадатковую спецыяльнасць на базе Акадэміі кіравання, слаба запатрабавана рэгіёнамі. Звяртаючыся да кіраўнікоў Беларускага саюза моладзі, Міхаіл Жураўкоў прапанаваў ім падумаць над тым, як прапагандаваць працу моладзі ў сельскай мясцовасці: «Прыдумайце нейкі праект па пошуку і падрыхтоўцы лідараў. Гэта ваша поле дзейнасці і сфера інтарэсаў». Аднак, як высветлілася, у самой рэспубліканскай грамадскай маладзёжнай арганізацыі таксама адчуваецца дэфіцыт людзей, гатовых павесці моладзь за сабой. Каб неяк выправіць сітуацыю з недахопам маладзёжных лідараў і актывізаваць моладзь, у 2016 годзе БРСМ плануе запусціць комплекснае мерапрыемства «Лесвіца поспеху».

Кіраўнік Міністэрства адукацыі падкрэсліў, што пытанні маладзёжнай кадравай палітыкі актыўна абмяркоўваюцца ва ўрадзе. Наколькі паспяхова будзе функцыянаваць сістэма адукацыі, а таксама іншыя сферы, залежыць ад таго, наколькі адказна ў тым ці іншым міністэрстве і ведамстве будуць ставіцца да падрыхтоўкі рэзервістаў і кіраўніцкага звяна.

— Мы ў сваім ведамстве распрацавалі спецыяльную праграму па рабоце з кадравым рэзервам. Да таго ж і перад Грамадскім студэнцкім саветам, і перад Рэспубліканскім маладзёжным саветам пастаўлена задача — шукаць у сваім асяродку маладых людзей з ярка выражанымі лідарскімі задаткамі, — дадаў Міхаіл Жураўкоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Шанц

## ДЫРЭКТАР ШКОЛЫ — ГЭТА ПРЭСТЫЖНА!

**Конкурс «Малады дырэктар установы агульнай сярэдняй адукацыі — 2016» аб'яўлены ў Мінскай вобласці. Яго мэта — фарміраванне пазітыўнага іміджу кіраўнікоў.**

У конкурсе могуць прыняць удзел па адным прадстаўніку ад кожнага раёна Мінскай вобласці і горада Жодзіна з ліку дырэктараў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі са стажам працы на пасадзе ад двух да пяці гадоў. Конкурсныя мерапрыемствы будуць праводзіцца ў два этапы. Першы складаецца з двух тураў. У першым (завочным) туры будзе зроблена экспертная ацэнка сайта ўстановы адукацыі, конкурснага эсэ і праграмы развіцця ўстановы адукацыі. Другі (вочны) тур прадугледжвае тэсціраванне, скіраванае на выяўленне ўзроўню навукова-метадычнай і псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі канкурсантаў. У фінале канкурсантаў чакаюць таксама публічная абарона праграмы развіцця ўстановы адукацыі, прадстаўленай на першым этапе, і ўдзел у прафесійных дэбатах. З ліку фіналістаў конкурсу рашэннем журы вызначаюцца пераможца і лаўрэаты. Іх імёны стануць вядомы ў красавіку наступнага года.


**Беларучский сельский исполнительный комитет Минской области Логойского района сообщает о проведении 11 января 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного индивидуального жилого дома д. Приселки, РИЗ «Дубровка»**

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Участок № 13, кадастровый номер земельного участка 623280406601000118 | 0,1210 | Подъезд с грунтовой дороги, возможность подключения к электроснабжению | 27 498 702 | публикация в газете: + 8470041 + 3541189 + 684000 | 2 750 000 |
| 2 | Участок № 29, кадастровый номер земельного участка 623280406601000116 | 0,1206 | Подъезд с грунтовой дороги, возможность подключения к электроснабжению | 27 407 797 | публикация в газете: + 8272862 + 3541189 + 684000 | 2 741 000 |

*Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011127 в ЦБУ № 611 филиала № 500 — Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, УНП 600181549, получатель — Беларучский сельский исполнительный комитет.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах открытого аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками, выставляемыми на аукцион.

**Аукцион состоится 11 января 2016 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.**

Последний день приема заявлений – **5 января 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **(801774) 58 4 35, 58 4 45.**



ЗАСО «Промтрансинвест»

**ПРЕДЛАГАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ в процедуре закупки № 2015-298722,**

**размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по изготовлению Бланк «Страховое свидетельство. Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования)», тираж – 60 000 шт., тел. (17) 222 75 39.**

УНП 100357923



**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:**

- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 3855117-3855129;

- полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ № № 0924078-0924080, 0984201, 1260780;

- полис по добровольному страхованию от несчастных случаев (2РН, 2РП) серии НС № 0019627.

УНП 100782388



В извещении о проведении аукциона **по продаже четырехкомнатной квартиры в г. Минске по ул. Кирова, 2, квартира 24**, опубликованном в газете «Звязда» от 09.12.2015 последние предложения заменить на «Аукцион состоится **22.12.2015** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.12.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 400091131

■ Блізкая ўлада

# ВЯЛІКАЕ ПЕРАСЯЛЕННЕ

**Падчас асабістых прыёмаў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміру ДАМАНЕЎСКАМУ даводзіцца тлумачыць грамадзянам змяненні ў Жыллёвым кодэксе**



Гэтым разам магчымасць падзяліцца набалелым была ў 14 чалавек. Іх праблемы інакш, чым балючымі, не назавеш. Па адным і тым жа пытанні ад імя жыхароў пяці дамоў па вуліцах Заслонава і Будаўнікоў звярнуліся адразу некалькі магіляўчан. Двухпавярховікі, дзе яны жывуць, у свой час здаваліся без выгод. Але людзі атрымлівалі ордэры як на кватэры і здымаліся з чаргі на жыллё. Пытанні ўзніклі пасля таго, як некалькі гадоў таму ў Магілёве «Будтрэст №12», на балансе якога знаходзяцца гэтыя больш чым паўвекавой даўніны пабудовы, стаў перасяляць жыхароў у інтэрнаты. З тымі, хто быў не згодны, размова ішла праз суд. «Вялікае перасяленне» працягваецца. Сёлета такі лёс напаткаў дом № 29 па вуліцы Заслонава. Жыхары ў роспачы, асабліва тыя, каму ўжо засталося недалёка да пенсіі. Шанцаў пабудаваць уласнае жыллё ў іх няма. Людзі спадзяюцца, што іх дамам будзе нададзены статус жылых. На прыём да губернатара яны прыйшлі з архіўнымі дакументамі, якія пацвярджаюць, што пры будаўніцтве іх дамы мелі такі статус. Вось толькі чамусьці адпаведнай дакументацыі няма ў Будтрэсце. Губернатар даў даручэнне адказным службовым асобам разабрацца з праблемай і праінфармаваць гараджан.

Сужэнцы з Магілёва прыйшлі ў спадзяванні, што ім дапамогуць урэгуляваць сітуацыю з будаўніцтвам іх дома. Праз непрыязныя адносіны з суседам, які таксама будуецца, справа зайшла ў тупік. Як высветлілася, пры праектаванні былі зроблены памылкі, якія пагоршылі становішча заяўнікаў.

Яшчэ для двух магіляўчан падставай для звароту стаў нездавальняючы стан фасада школы №18 і прылеглай да яе тэрыторыі. Яны лічаць, што лесвіца, якая вядзе да школы, уяўляе небяспеку, бо не мае парэнчаў. А дарогі тут такія, што можна зламаць ногі. Жыхарка вёскі Цішоўка паскардзілася на Магілёўскі райвыканкам, які не прымае мер у дачыненні да яе суседа. Яна бачыць прамую сувязь паміж яго будаўніцтвам і падтапленнем яе падвала. Заяўніца з аграгарадка Рэчкі незадаволена тым, што на вуліцы Ніжняя, дзе яна жыве, дагэтуль няма каналізацыйнай сеткі. Яна сцвярджае, што пытанне будаўніцтва разглядалася не аднойчы і на розных узроўнях. Жанчына спадзяецца, што вуліца ўсё ж такі будзе ўключана ў наступную праграму «Чыстая вада» і грошы на гэта знойдуцца.

Уладзімір Даманеўскі даручыў адпаведным службам яшчэ раз дасканала вывучыць пытанні, якія прагучалі падчас прыёму, і ў кароткія тэрміны прыняць меры па іх вырашэнні. Заяўнікі павінны атрымаць па выніках сваіх зваротаў аргументаваныя адказы.

— Можна канстатаваць, што шэраг пытанняў, якія раней паступалі, страцілі сваю актуальнасць, — падвёў вынікі прыёму кіраўнік вобласці. — У гэтым вялікая заслуга гарадскіх службаў, якія шмат чаго робяць па добраўпарадкаванні. Разам з тым застаюцца нявырашанымі праблемы водаправоднага абслугоўвання і водаадвядзення ў індывідуальнай забудове. У першую чаргу гэта датычыцца Магілёўскага раёна, дзе цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва. Другое пытанне, якое сёння падымаецца, забеспячэнне жыллём. Мы не паспяваем праводзіць тлумачальную працу і даводзіць да людзей змяненні ў Жыллёвым заканадаўстве. Людзі звяртаюцца з абгрунтаванымі, на іх погляд, праблемамі, але мы бачым, што яны выходзяць за рамкі дзеючага заканадаўства. Прыходзіцца падчас прыёму тлумачыць, як выйсці з гэтай сітуацыі.

Што датычыцца школ, то мы шмат увагі надаём наяўнасці агароджы вакол адукацыйных устаноў, як таго патрабуе Міністэрства адукацыі, адпаведнай дарожнай разметцы і знакам, каб на шляху школьніка не было пагрозы для яго бяспекі. Некаторыя школы сапраўды патрабуюць капітальнага рамонту фасадаў. Мы абмяркоўвалі гэта яшчэ на пасяджэнні ў гарвыканкаме і вызначылі для сябе, што пры фарміраванні бюджэту на наступны год будзем улічваць прывядзенне іх у парадак. У планах 18-я і 7-я школы ў Магілёве — зоймемся імі ў першую чаргу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «МУКАСНЕГ» У САЛІГОРСКУ

**У аўторак у горадзе калійшчыкаў адбылося надзвычайнае здарэнне. У сярэдзіне дня частка горада раптоўна апынулася пад белым покрывам. Вось толькі на зямлю лёг не снег, а мука.**




— Інцыдэнт адбыўся на тэрыторыі Салігорскага філіяла Барысаўскага камбіната хлебапрадуктаў, — паведамілі «Звяздзе» ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Калі з аўтамабіля разгружалі муку пад ціскам, у яго сарвала люк. Усяго рассыпалася каля 200 кілаграмаў мукі з 14 тон. Пад слоем яе апынуліся кавалак праезнай часткі і аўтамабілі, якія былі прыпаркаваныя ля прадпрыемства. На шчасце, ад «мучнога» шторму ніхто не пацярпеў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## З ПАЛКАЙ — НА ПАШТАЛЬЁНА

**У сталіцы за напад на паштальёна затрымалі... 77-гадовую бабулю.**

— Работнік пошты разносіла пенсіі па пад'ездзе, у тым ліку і гэтай пажылой жанчыне. Бабуля, атрымаўшы свае грошы, надзела... на галаву парык, узяла палку і пачала караўліць паштальёнку на першым паверсе, — распавяла журналісту «Звязды» прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра ПАПОВА. — Калі тая спусцілася ўніз, бабуля пачала лупцаваць яе палкай, паваліла на падлогу. Бедная жанчына змагла ўстаць і выбегчы на вуліцу. Яна хацела зачыніць за сабой дзверы, але нападаўшая паспела прасунуць нагу ў дзвярны праём. Але калі бабуля пачула, што паштальёнка звоніць у міліцыю, дык вярнулася ў сваю кватэру, пакінуўшы ў дзвярах красоўку (пажылая жанчына была ў спартыўным абутку). Там выкінула праз акно парык, палку і другую красоўку. Пазней яна аргументавала свой учынак тым, што вельмі любіць серыялы. Нядаўна ў адным з іх яна ўбачыла, як герой пры дапамозе палкі адным ударам па галаве «выключае» чалавека. І... вырашыла паспрабаваць. Заведзена крымінальная справа па артыкуле за хуліганства. Паштальёнка моцна не пацярпела, у яе сінякі.

## ЗА РУЛЁМ «ПАД ГРАДУСАМ» — У СЁМЫ РАЗ

**30-гадовага мінчаніна затрымалі за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення... у сёмы раз.**

— За дзесяць гадоў мужчына менавіта столькі разоў пападаўся за рулём падшафэ, прычым экстрэмальная язда амаль заўсёды заканчвалася для яго стварэннем ДТЗ. У адносінах да яго заводзілася крымінальная справа за язду ў стане алкагольнага ап'янення паўторна цягам года. Апроч таго, праваахоўныя органы выкрывалі маладога чалавека ў шматлікіх крадзяжах. За падобныя паводзіны грамадзянін паспеў ужо адбыць некалькі тэрмінаў і пабываць у папраўчай калоніі. У 2013 годзе, акрамя асноўнага пакарання за крадзеж, суд прыняў рашэнне ў яго адносінах прымяніць прымусовае лячэнне ад алкагалізму, — паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.

Апошняя спроба праехацца на аўто п'яным таксама скончылася для мінчаніна аварыяй. Увечары на вуліцы Ванеева, кіруючы БМВ, ён урэзаўся ў яшчэ адно БМВ. Пазней у крыві парушальніка было выяўлена звыш 2,8 праміле алкаголю. Зараз у адносінах да мінчаніна складзена пяць адміністрацыйных пратаколаў. Апроч ДТЗ у нецвярозым стане, спіс папоўніўся яшчэ і яздой без права кіравання, а таксама адсутнасцю страхоўкі і тэхагляду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

## «Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова»

**Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь**
**ИНФОРМИРУЕТ ФИЗИЧЕСКИХ И ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ О СОЗДАНИИ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.**

**Информация о застройщике.**

Застройщик – Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь, зарегистрирован решением Министерства юстиции Республики Беларусь от 14.04.2006 г. №185 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100265118. Адрес местонахождения: 220020, г. Минск, ул. Радужная, д. 27/2.

По вопросам заключения договоров долевого строительства обращаться в торгово-строительное унитарное предприятие **«Олимпийские проекты»**, УНП 190191720. Предприятие выполняет функции заказчика по договору-поручения.

Адрес заказчика: 220012, г. Минск, пр. Независимости, 80а, ком. 10-14.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 13.45.

Телефоны для справок: 280-80-98, 287-34-84.

В течение предыдущих трех лет предприятие осуществляло функции заказчика при строительстве объекта «Штаб-квартира Национального олимпийского комитета Республики Беларусь».

**Информация о проекте строительства**.

«Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова» расположен в г. Минске.

Начало строительства – 20.11.2012 г., окончание строительства 22.12.2015 г.

Строящийся дом – 24-этажное монолитно-каркасное здание со встроенными помещениями общественного назначения на 2-х этажах (административно-офисные – 857,3 м кв., стоматологический кабинет – 70,5 м кв.), подземной гараж-стоянкой на 54 машино-места, крытой автостоянкой на 17 машино-мест, пешеходного путепровода (моста), ПНС, коммуникационного канала и трасс инженерных сетей, благоустройством территории с устройством открытой автостоянки на 40 м/мест. Общая площадь объекта 19329 м кв. (жилое здание, встроенные помещения, гараж, технические этажи). Высота типового этажа – 3,0 м. Количество секций – 1; количество квартир 110, в том числе: однокомнатных – 1; двухкомнатных – 20; трехкомнатных – 64; четырехкомнатных – 24; пятикомнатных – 1. В доме предусмотрено пять лифтов, помещение товарищества собственников.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства на территории возле данного многоэтажного жилого дома предлагается крытая автостоянка (гаражные места) на 17 машино-мест. Стоимость 1-го машино-места составляет 25000 долларов.

Оплата в белорусских рублях по курсу Национального банка на день платежа, либо в валюте, при заключении договора с нерезидентом. Условия оплаты: 100% стоимости подлежит оплате в течение 7 рабочих дней со дня регистрации договора.

Участок для строительства жилого дома расположен на территории Первомайского района г. Минска в границах пр. Независимости – ул. Филимонова – Слепянская водная система – ул. Макаенка. Предусмотрено комплексное благоустройство территории. Для исключения транзитного пешеходного движения по дворовой территории предусматривается строительство эстакады, обеспечивающей связь между ул. Филимонова, Школой олимпийского резерва, общежитием и спортзалом.

В общую собственность дольщиков поступят лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, лестничные клетки, лестницы, технические этажи, подвалы, техподполье и другие места общего пользования, несущие и ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**Данные о правах на земельный участок, сведения о договорах строительного подряда и результатах государственной экспертизы:**

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации в отношении земельного участка №500/986-9229 от 16.12.2013 года (взамен свидетельства от 30.07.2011 г.);

- договор строительного подряда от 10.10.2012 г. №3/12 с СЗАО «Ареса-сервис-строй»;

- экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 26.03.2010 г. №2236-5/09, дополнение к заключению от 08.08.2013 №598-15/13.

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 г. №263 после опубликования данной проектной декларации будут приниматься заявления от физических и юридических лиц на заключение договоров создания объекта долевого строительства.


■ Зямельны аўкцыён

# МІНСК ПРАДАЕ ЎЧАСТКІ ПАД ПРЫВАТНАЕ ЖЫЛЛЁ

**Самы маленькі ўчастак абыдзецца новаму гаспадару больш як у 24 тысячы долараў у эквіваленце**

**Аўкцыён па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць гарадскія службы запланавалі правесці ўжо 17 снежня. Цяпер на таргі выстаўляюць шэсць участкаў з сярэдняй плошчай ад 5 да 10 сотак кожны. Для ўдзелу ў аўкцыёне неабходна не толькі падаць адпаведную заяўку, але і да 14 снежня ўнесці задатак, які складае 15% ад стартавай цаны аб'екта.**

Маленькія ўчасткі (да 5 сотак) са стартавай цаной каля 400 млн рублёў маюць прапіску ў Заводскім раёне па вуліцах Сечанава і Ахоцкая. Яшчэ адзін участак (да 9 сотак) у Заводскім раёне па завулку Малы Трасцянец выстаўлены за 520 млн рублёў. Тры зямельныя ўчасткі выстаўляюць на продаж Фрунзенскі раён, дзе адзін надзел знаходзіцца на месцы былой вёскі Масюкоўшчына, а яшчэ два — па завулку 2-гі Радыятарны. Гэтыя ўчасткі маюць плошчу ад 8 да 10 сотак і прапануюцца ўжо па кошце ад 1,13 млрд да 1,23 млрд рублёў.

Арганізатары аўкцыёну адразу нагадваюць, што, калі на ўчастак будзе пададзена адна заяўка, ён дастанецца заяўніку па цане, павялічанай толькі на 5%. Акрамя таго, пераможца таргоў павінен пакрыць выдаткі на арганізацыю і правядзенне аўкцыёну, у тым ліку тыя, што звязаны з вырабам і прадстаўленнем удзельнікам дакументацыі, неабходнай для яго правядзення. Гэта яшчэ каля 28 млн рублёў.

Такім чынам, атрымліваецца, што самы слабенькі ўчастак у Заводскім раёне будзе прададзены аднаму заяўніку за 445 млн рублёў (24 тысячы долараў). А мінімальны кошт (практычна без таргоў) самага дарагога ўчастка ў Фрунзенскім раёне складзе больш за 72 тысячы долараў.

Сярод іншых умоў аўкцыёну пераможца павінен атрымаць у вызначаным парадку тэхнічную і дазвольную дакументацыю на будаўніцтва жылога дома, а потым на працягу аднаго года заняць зямельны ўчастак (ажыццявіць будаўніча-мантажныя работы).



У Мінску такі каркасны дом (плошчай да 80 «квадратаў») цяпер прадаюць "пад ключ" за 22-27 тысяч долараў.

**Асобна адзначу яшчэ адзін сур'ёзны момант, які тычыцца арганізацыі гэтага аўкцыёну. Цяпер у ім допускаецца ўдзел на баку пакупніка і кансалідаваных удзельнікаў — двух і больш грамадзян. Гэта значыць, што, напрыклад, можна купіць участак не на адну, а нават на дзве-тры сям'і і пабудаваць там у складчыну шыкоўны блакіраваны дом. Тут галоўнае — не пасварыцца пры сумесным фінансаванні праекта.**

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Юрыдычная дапамога

# КАБ ХАТА НЕ СПАЗНАЛА НІ ЎРАЧА, НІ АДВАКАТА

## Калі хочаце абараняць свае правы, іх трэба ведаць

**Як уладкавацца на працу і дамовіцца з судовымі выканаўцамі, што трэба ведаць пра аліменты і спадчыну, калі і за што плаціць падаткі, які прыбытак з чэкаў «Маёмасць»... Гэтыя і іншыя пытанні, што найбольш хвалююць беларусаў, выкладзены ў спецыяльных бюлетэнях, выдадзеных для інфармавання грамадзян аб іх правах.**

Поўнакаляровыя выданні можна знайсці ва ўстановах міністэрстваў і арганізацый, якія сталі ўдзельнікамі акцыі «Права на службу людзям», што другі год праводзілася Міністэрствам юстыцыі. Важна, каб чалавек разумеў перавагі, якія дае яму правільнае прымяненне правоў і карыстанне імі ў жыцці, а таксама памятаў, што няведанне закону не з'яўляецца аргументам ці доказам невінаватасці. Такой думкі прытрымліваюцца ўсе ўдзельнікі акцыі.

*— Некаторыя грамадскія стасункі не падуладныя праву: любоў, сяброўства, прыхільнасць. Але калі вы збіраецеся ажаніцца, нараджаеце дзіця, купляеце сумесную маёмасць, то патрапляеце ў сферу прававога рэгулявання і атрымліваеце наступствы, звязаныя з гэтым,* — падкрэсліў **Сяргей ЗАДЗІРАН, намеснік міністра юстыцыі.**

Мінюст падрыхтаваў буклет **«Пра што нагадваюць судовыя выканаўцы».** У ім даступнымі словамі расказана пра наступствы невыканання прадпісанняў суда па аплаце штрафу (на што прыватным асобам даецца месяц, а юрыдычным — 15 дзён). Калі час пратэрмінаваны, арыштоўваюцца маёмасць і банкаўскія рахункі даўжніка, яму забараняецца кіраваць транспартнымі сродкамі, часова выязджаць за мяжу, атрымліваць маёмасць ад іншых асоб і іншае.

### ПРА АЛІМЕНТЫ І СПАДЧЫНУ

*— Важна данесці да грамадзяніна інфармацыю пра механізмы, якія выкарыстоўваюцца для яго абароны,* — запэўніў **Віктар ЧАЙЧЫЦ, старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў.** — *Доўгі час лічылася, што грамадзянам не трэба ведаць пра свае правы — няхай лепш прыходзяць да адвакатаў па тлумачэнні. Цяпер, наадварот, адвакаты зацікаўлены, каб людзі ведалі больш і часцей звярталіся да прафесіяналаў з пытаннямі, як абараніць і рэалізаваць свае правы.*

Ён заклікаў грамадзян берагчы чыноўнікаў і не перакладваць на плечы праваахоўных органаў і судовых супрацоўнікаў абавязкі па аказанні кансультацыйных паслуг, якія ажыццяўляюць адвакаты. Да таго ж яны могуць не толькі растлумачыць праблему, але і дапамагчы напісаць, калі трэба, пэўны зварот ва ўстанову адпаведнага ўзроўню.

Калегія адвакатаў падрыхтавала бюлетэнь **«Што трэба ведаць пра аліменты».** Дарэчы, па гэтых пытаннях, а таксама па праблемах аднаўлення на працы звычайна аказваецца бясплатная юрыдычная дапамога.

Спецыялістамі Беларускай натарыяльнай палаты распрацаваны бюлетэнь **«Што трэба ведаць, калі адкрылася спадчына».** Там пералічаны падставы для ўступлення ў спадчыну, формы, спосабы і тэрміны (не пазней за 6 месяцаў пасля смерці грамадзяніна), а таксама магчымасці адмовіцца ад права на спадчыну. Дарэчы, прэтэндаваць на яе могуць як асобы, якіх пэўным чынам нешта звязвала з памерлым грамадзянінам, так і сваякі, зачатыя падчас яго жыцця, але народжаныя ўжо пасля смерці.

### ПРА МАЁМАСЦЬ І ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦЬ

Прадстаўнікі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь вызначылі ажно тры напрамкі сваёй дзейнасці, якія патрабуюць большага тлумачэння і асвятлення для грамадзян: **«Абарачэнне імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць», «Дзяржаўная рэгістрацыя нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй» і «Адчужэнне зямельных надзелаў, што былі дадзены грамадзянам, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў».** У апошнім, напрыклад, прапісаны моманты, калі грамадзянін можа адмовіцца ад надзелу; расказана, якім чынам можна выкупіць зямлю, дадзеную ў пажыццёвае карыстанне або арэнду.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У брашуры **«У дапамогу суіскальнікам пры працаўладкаванні»,** падрыхтаванай Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, выкладзены асноўны шэраг абавязковых да прапісвання ў дагаворы пунктаў. Гэта месца працы, працоўныя функцыі, памер зарплаты, дні яе выплаты і г.д.

### КАМУ БЯСПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ?

Асобны буклет прысвечаны тэме **«Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Сацыяльнае абслугоўванне непрацаздольных грамадзян».** Тут — коратка і даступна — пра дапамогу, якую могуць атрымаць старыя, непрацаздольныя і адзінокія людзі.

Самы асноўны і запатрабаваны напрамак працы такіх цэнтраў — дапамога на даму. Бясплатна яе могуць атрымліваць адзінокія і непрацаздольныя, чый прыбытак ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ). Часткова аплачваюць паслугі тыя, у каго прыбытак не вышэйшы за 200% БПМ. Астатнія плацяць цалкам.

Аддзяленні тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання могуць аказваць паслугі сядзелак, прычым нават тым грамадзянам, якія жывуць разам са сваімі блізкімі, але пэўны час будуць адсутнічаць. Для адзінокіх старых, якія на 100% страцілі здольнасць да самаабслугоўвання, паслугі сядзелкі бясплатныя.

**Ірына СІДАРОК**

■ Нефармат

# ПРЫНЦ І РУЖА ПРЫСНЯЦЦА ТАБЕ



ЁСЦЬ жа такія людзі, якія ўсім на свеце незадаволены. І дрэннае ім дрэнна, і ў добрым яны дрэннае абавязкова знойдуць. Але адна справа, калі бубніць і абураецца сварлівая цётка, — тады падумаеш, можа, яе муж крыўдзіць, магчыма, ён п'яніца ці яшчэ што. А ў мінулую нядзелю мне проста фатальна «шанцавала» на сварлівых дзядзькаў. Першы ў аўтобусе на ўвесь салон абураўся, што ў яго два разы за паездку праверылі білет. Шмат новага пра сябе даведаліся ў той дзень кантралёры: і што яны швэндаюцца, бо ім няма чаго рабіць, і што занадта павольныя, і што перашкаджаюць яму сядзець спакойна. Невядома, праўда, якім чынам. Я паспрабавала нясмела ўступіцца за жанчын у форменных накідках, сказала, што яны робяць сваю справу. Нестары яшчэ мужчына, дзесьці ў раёне 50 гадоў, стаў абурацца яшчэ гучней. Праўда, кантралёры, прывычныя да падобных сцэн, ніяк не адрэагавалі на выпад пасажыра. І гэта была правільная рэакцыя.



Бо не варта ўступаць у палеміку альбо даказваць нешта таму, хто не мае іншай мэты, як выплюхнуць на навакольных свой негатыў. У той жа дзень пасля прыезду ў цэнтр горада і не вельмі ўдалага паходу па крамах мы з дачкой прыпыніліся на алеі ліхтароў ля майго любімага Маленькага прынца. Там стаяла маці з дзецьмі і вельмі прыгожа пераказвала малым змест добрай казкі Экзюперы. Дзеці, з выгляду вучні малодшых класаў, уважліва разглядвалі скульптуру прынца, нешта пыталіся ў мамы, удакладнялі. Маці сказала ім: «Вернемся дадому, перачытаем «Маленькага прынца», раскажу вам пра яго аўтара». Тут падышоў грамадзянін, які адпачываў на суседняй лаўцы, і пачаў сваю прамову. Адразу стала ясна, што дзядзька, невыразнай знешнасці, цяжка вызначальнага ўзросту, толькі і чакаў моманту, каб выказацца. Сваё абурэнне ён адрасаваў і гарадскім уладам, і аўтарам ідэі алеі ліхтароў, і раўнадушнай грамадскасці, якая не разумее недарэчнасці на брэсцкай вуліцы «чужых» герояў. «Хто нам француз Экзюперы з яго дзіваком-прынцам?» — прыкладна такую думку імкнуўся данесці чалавек у сваёй шматслоўнай і блытанай тырадзе. Чамусьці напомніў ён мне героя іншага твора, які раптам «саткаўся з паветра». Я разгадала гэты прымітыўны псіхалагічны прыём, які часам называюць паглынаннем чужой энергіі, і хацела ўжо павярнуць. А маладая сімпатычная жанчына, што называецца, папалася. Яна пачала спрачацца, абурацца ў адказ, накшталт: «Як вы можаце?! Хіба Маленькі прынц мае дачыненне да Францыі большае, чым да нашай краіны? Ён жа — насельнік іншай планеты. І ніхто ў свеце не напісаў пра дружбу, пра шчырыя чалавечыя адносіны лепей, чым Антуан дэ Сент-Экзюперы ў яго «Пісьме заложніку...» Я зразумела, што трэба ўмяшацца і паклікала яе з сабой, адвяла ад гэтага чужароднага элемента.

МЫ пайшлі па алеі далей і разгаварыліся. Дзіяна раптам расказала сваю гісторыю. Родам яна з Расіі. Прыехала сюды за мужам. Усё ў іх было цудоўна. Нарадзіліся вось гэтыя сімпатычныя двайняткі. Яны з мужам узялі крэдыт і сталі будаваць кватэру. Яшчэ не паспелі ўсяліцца, як спасцігла гора: муж загінуў у аварыі. Ёй тады многія раілі вяртацца да бацькоў, пад Піцер. Але ў іх жыллёвыя ўмовы таксама не вельмі, а тут грошы ўкладзены, кватэра была на падыходзе. Праўда, як яна будзе выплачваць крэдыт, як адна паднімаць дзяцей, тады зусім не ўяўляла.

Сябры мужа дапамагалі. Тыя, з кім раней хадзіў у паходы (Іван захапляўся турызмам), не пакінулі яе сам-насам з праблемамі. Найбольш яна ўдзячна за тое, што дапамаглі на добрую работу ўладкавацца пасля дэкрэтнага, каб магла выплачваць пазыку. А раней, калі сядзела дома з дзецьмі, ведала, што заўсёды можа пазваніць некаму з сяброўак, калі трэба, напрыклад, у паліклініку ці нешта купіць, падвезці. «Каб не гэтыя чужыя людзі, не ведаю, як выжыла б, — гаворыць маладая жанчына і працягвае: — Сёння чытала інтэрв'ю адной вядомай актрысы, яна кажа, што здрабнелі людзі, здрабнелі адносіны. Я не магу пагадзіцца. Бо людзі ёсць зусім не дробныя і не ўсё вымяраецца грашыма. І гэта самае важнае ў жыцці, я цяпер ведаю...» Нешта вельмі добрае ішло ад той выпадковай жанчыны, як святло ад ліхтара на начной вуліцы. Здавалася, яна гатова дзяліцца дабром, тым, якое атрымала ад іншых.

Я прыйшла дадому, перачытала «Пісьмо заложніку» і знайшла там радкі, пра якія, відаць, гаварыла Дзіяна: «Аснова ўсялякай культуры найперш за ўсё — у самім чалавеку. Найперш за ўсё — гэта ўласцівая чалавеку сляпая, неадольная прага цеплыні. А потым скрозь памылкі чалавек знаходзіць дарогу да агню. Вось таму, мой сябар, мне так патрэбна твая дружба. Мне, як глыток вады, патрэбен таварыш, які паднімаецца над спрэчкамі, якія народжаны розумам, паважае ўва мне паломніка, які ідзе да гэтага агню».

ТОЕ ж толькі іншымі словамі гаварыў і Маленькі прынц, які сапраўды не мае ні краіны, ні нацыянальнасці. І добра, што своеасаблівы помнік яму ёсць у Брэсце і што ў адной з беларускіх калыханак ёсць словы: «Прынц і ружа прысняцца табе».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ФЕЕРВЕРК НЕ АДБЫЎСЯ

У Гомелі канфіскавана піратэхніка на 243 мільёны рублёў. Індывідуальны прадпрымальнік не меў суправаджальных дакументаў на вялікую партыю петард і феерверкаў.Супрацоўнікі міліцыі, у якіх былі падставы на агляд жылля, праверылі тры адрасы: прыватны дом у Добрушскім раёне і дзве кватэры ў абласным цэнтры. У жылых памяшканнях знаходзіліся піратэхнічныя вырабы імпартнай вытворчасці ў асартыменце. Яны былі спакаваны ў кардонныя скрыні. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, канфіскавана 158 066 штук разнастайнай піратэхнікі на агульную суму 243 671 000 рублёў. Цяпер праводзіцца дадатковае вывучэнне матэрыялаў справы, якая будзе перададзена ў інспекцыю па падатках і зборах для прыняцця рашэння аб прыцягненні 35-гадовага гамяльчаніна да адміністрацыйнай адказнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**22.12.2015 г. в 12.00 проводит повторный открытый аукцион без условий по продаже *БАЗЫ ОТДЫХА В ЧЕЧЕВИЧАХ, принадлежащей ОАО «Могилевский металлургический завод»***

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | Капитальное строение с инв. № 702/С-809 – Спальный корпус на базе отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-811 – Баня базы отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-808 – Спальный корпус-4 базы отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-814 – Здание топочной базы отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-813 – Кухня базы отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-806 – Дом базы отдыха № 3; капитальное строение с инв. № 702/С-807 – Дом базы отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-812 – Склад на базе отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-815 – Электроподстанция с в/вольтными сетями на базе отдыха; капитальное строение с инв. № 702/С-816 – Туалет в Чечевичах; капитальное строение с инв. № 702/С-817 – Уборная на базе отдыха, а также сооружения и имущество согласно перечня |
| **Адрес** | Могилевская область, Быховский район, Черноборский с/с, 0,6 км севернее д.Чечевичи |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС, руб.** | **7 180 000 000** |
| **Сумма задатка и расчетный счет для его внесения** | **150 000 000 рублей**, получатель платежа Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 721385600001000016, площадью 4,8718 га, расположенный по адресу: Могилевская область, Быховский район, Черноборский с/с, 0,6 км севернее д. Чечевичи |

Регистрация на участие в аукционе осуществляется по адресу: **г. Могилев, ул. Лазаренко, 29, до 21 декабря 2015 года до 15.00 включительно**

*Информация о предыдущем аукционе была размещена в газете «Рэспубліка» от 23.09.2015*

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: **(8-0291) 400-394 vel.; (8-029) 624-26-25; bti9@yandex.ru**

Сямейная газета
Выпуск № 20 (43)



Фота Надзеі БУЖАН

## ЛІСТ ДЗЕДУ МАРОЗУ

Дарагі Дзед Мароз! Усё, я вырашыла: з новага года пачынаю новае жыццё!

Напісала гэта і... злавіла сябе на думцы, што яблычак ад яблынькі недалёка коціцца. Толькі што пагаварыла па тэлефоне з мамай. На днях ёй павінны зрабіць аперацыю. Яна хвалюецца, накручвае сябе: і сама не заўважыла, як падчас размовы некалькі разоў папытала «а як я там?».

— А як ты тут? — чарговы раз спрабую вярнуць блізкага чалавека з надуманай будучыні ў цяперашні момант. Бо жыццё ўжо даўно даказала бессэнсоўнасць тых хвалявання. Усё роўна будзе так, як павінна быць.

...Аднойчы настаўнік паклікаў сваіх вучняў, узяў белы ліст паперы, капнуў на яго чарніла і спытаў:

— Што вы бачыце?

— Чорную пляму, — адказаў першы.

— Кляксу, — выказаў здагадку другі.

— Чарніла, — упэўнена прамовіў трэці.

Настаўнік нічога не сказаў. Прос та развярнуўся і сышоў. Адзін з вучняў вырашыў яго дагнаць і спытаў:

— Штосьці не так? Чаму вы засмуціліся?

Настаўнік цяжка ўздыхнуў:

— Ніхто з вас не ўбачыў белага ліста...

Гэтаксама і мы... З лёгкасцю бачым недахопы навакольных, слабыя месцы сваіх блізкіх, негатыўныя падзеі, дрэнныя прадвесці, сны. Пры гэтым ва ўпор не хочам заўважаць галоўнага — белага ліста. Мы не бачым сваё жыццё. Жыццё як Божы дар. Пастаянна адкладаем яго на заўтра, панядзелак, новы год...

Тысячу разоў ад самых розных людзей чула фразы накшталт: «абараню дыплом — вось тады жыццё пачнецца», «дабудуем кватэру — можна жыць», «адпачынак не за гарамі — пажыву як чалавек», «на новую працу ўладкуюся — зажыву», «дзяцей на ногі паставім — пажывём нарэшце для сябе», «на пенсію выйду — можна пажыць»...

Усё б нічога, але... Пакуль мы адкладваем жыццё на потым — яно праходзіць. Ды і заўтра, панядзелка, новага года можа і не быць...

«Надзейка, ніяк не выплыву :( Мару пачаць новае жыццё без курсаў, з любімымі сябрамі, з панядзелка», — адказвае сяброўка на маё паведамленне ў аўторак. І, што вы думаеце, праз некалькі гадзін, не чакаючы таго няшчаснага панядзелка, забягае ў госці. Стомленая, ненафарбаваная, але забягае. Абдымае. Усміхаецца. І, сама таго не разумеючы, стымулюе мяне таксама не адкладаць ВАЖНУЮ справу. І пачаць нарэшце новае жыццё, не чакаючы новага года.

**Надзея ДРЫЛА.**

***P.S. Дзед Мароз, ты, напэўна, чакаеш, калі я нарэшце ў цябе штосьці папрашу? А я і не збіралася. Бо зразумела: толькі тое, што аддаеш, застаецца з табой.***

**У новым, 2016-м, годзе вы знойдзеце ў «Сямейнай газеце»:**

*— неверагодныя гісторыі кахання;*

*— карысныя парады і ідэі для ўсёй сям'і;*

*— незвычайныя вандроўкі;*

*— цікавыя конкурсы;*

*— душэўныя пасядзелкі на «Сямейнай кухні» і шмат чаго яшчэ...*

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ! БУДЗЕ ЦІКАВА!**

■ Сустрэча без абцасаў

Вера СЯРДЗЮК:

# «ВЯЛІКАГА ДУБА З МАЛЫМ КАРЭННЕМ НЕ БЫВАЕ»

**У дружнай сям'і матушкі Веры (якая да таго ж узначальвае цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля») ва ўсю ідзе падрыхтоўка да Новага года і Раства Хрыстовага. На падваконні стаяць зробленыя з дзеткамі са звычайных паўлітровых слоікаў падсвечнікі. На сцяне — праваслаўны адвент-каляндар з феяй... Пакуль бацюшка не вярнуўся з працы, а дзеці глядзяць мульцікі ды вучаць урокі, мы размаўляем па душах пра сваё, жаночае. Хочацца верыць, што гэтая размова натхніць кожнага з вас не толькі на тое, каб таксама пачаць рыхтавацца да чароўных зімніх свят, але і перагледзець стаўленне да адносін у сваёй сям'і.**



Фота Надзеі БУЖАН.



## Пра святога Мікалая, санкі і незадаволенага мужа

**Штогод раблю адвент-каляндар.** Гэта каталіцкая традыцыя, але яна мне вельмі падабаецца. Адвент дапамагае не забыцца пра важныя рэчы. Напрыклад, 19 снежня павесіць на барную стойку шкарпэткі, каб святому Мікалаю было куды пакласці дзецям падарункі. Ведаеце, адкуль пайшла гэта традыцыя? У аднаго ўдаўца было тры дачкі. Паколькі ён не меў грошай выдаць іх замуж, то вырашыў прадаць у публічны дом. Святы Мікалай даведаўся пра гэта і кожнай дачцэ падкінуў мяшэчак з золатам ...Кожнаму з нас патрэбен добры дзядуля.

**За елку ў нас адказваюць дзеці.** Яны бяруць санкі і едуць па яе на кірмаш. 30 снежня, калі пачынаецца традыцыйнае «а давайце прыбярэмся-перасварымся», мы з бацюшкам пакідаем дзяцей упрыгожваць елку, абяцаем па вяртанні штосьці смачненькае, а самі ідзём у кіно.

**Раней Новы год сустракалі ўсёй сям'ёй.** Але з нядаўняга часу айцец Павел стаў праводзіць начную службу. Бо ў нас у храме шмат самотных людзей. А адзінота ў навагоднюю ноч адчуваецца найбольш ярка. Першага студзеня мы звычайна збіраемся ў маёй мамы і «падводзім вынікі года». Нават у самых маленькіх пытаюцца: «А чаму ты навучыўся? Што зрабіў добрага?» Сёлета мы змайстравалі ёлачку, на якую будзем вешаць шарыкі са сваімі дасягненнямі. Я цалкам падтрымліваю каралеву з «Алісы ў краіне цудаў»: нават каб застацца на месцы, трэба вельмі моцна бегчы. І гэта пастаянны матыў нашых з бацюшкам размоў. Ці рэалізуем мы ўсе здольнасці, што ў нас уклаў Гасподзь? Ці ўсе магчымасці, якія Ён прадаставіў, мы змаглі распазнаць?

**У хрысціянскім шлюбе** пасля Бога ўсе сілы жанчына аддае мужу. Мой бацюшка таксама імкнецца зрабіць так, каб я адчувала сябе шчаслівай. Ён ніколі не спрабаваў пасадзіць мяне дома і прымусіць выключна супы варыць ды прыбіраць цэлымі днямі. Заўсёды бласлаўляе мае ініцыятывы. Я вельмі ўдзячная яму за гэта! Думаю, сакрэт устойлівасці нашага шлюбу ў тым, што ніхто з нас не становіцца перашкодай на шляху развіцця другога.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

■ Нясумныя выхадныя

# У МУЗЕІ ДЗЯЦІНСТВА

## Лялькі — гэта стварэнні, якія жывуць у іншым вымярэнні

**У Мінску з'явіўся інтэрактыўны Музей дзяцінства, з цацачнымі экспанатамі якога можна забаўляцца і нават ствараць іх самастойна. Наведвальнікаў пачастуюць ласункамі, праверацт на пільнасць і ўцягнуць у гульню. Плануецца, што захапляльныя экскурсіі па інтэрактыўных залах заменяць школьнікам некаторыя ўрокі, якія настаўнік зможа правесці прос та ў музеі.**

У незвычайным месцы ёсць чым заняцца і дзецям, і дарослым. Як высветлілася на пробных экскурсіях (афіцыйна музей пачне працаваць толькі з 15 снежня), наведвальнікі ўсіх узростаў з аднолькавым імпэтам шукаюць схаваныя сярод экспанатаў каробачкі з надпісамі «пакаштуй» ці «панюхай», адказваюць на пытанні і ўдзельнічаюць у латарэі з чароўнага капелюша Гары Потара.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Захавальніца музея, студэнтка гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Алеся ЧАРНЫШОВА, прызналася, што побач з такімі экспанатамі адчувае сябе вельмі камфортна.**

■ Нататкі таткі



# БЫЦЬ БАЦЬКАМ — ГЭТА...

**Нашай Васілісе ўжо год і дзевяць месяцаў. Гэты час, напоўнены радасцю, турботамі і адкрыццямі, праляцеў як адно імгненне. Нам з Вікай давялося шмат чаму навучыцца, шмат у чым змяніць лад свайго жыцця. Нярэдка па розных пытаннях кансультуемся ў сваіх бацькоў і знаёмых, вывучаем спецыяльную літаратуру. Але нідзе і ніколі не знайсці адказу на пытанне: што значыць быць татам? Вось якія сэнс за мінулыя амаль два гады гэтыя словы набылі асабіста для мяне.**

Быць татам — гэта ў адзін з доўгачаканых дзён спачатку хвалявацца, адлічваць кожную хвіліну, атакаваць тэлефон радзільні, а потым атрымаць навіну, якая пераверне тваё жыццё.

Сабраць самастойна ложачак, праверыўшы ўсё па дзесяць разоў, а потым кожны раз радавацца, назіраючы, як ёй утульна ў ім спаць.

Разгубіцца, калі ўпершыню сам апынешся ў дзіцячай краме, і накупіць шмат рэчаў, некаторыя з якіх так і не будуць надзетыя.

Зразумець і адчуць хваляванні сваіх бацькоў, якія раней здаваліся надуманымі і беспадстаўнымі.

Прачынацца сярод ночы не ад таго, што неабходна паправіць сваю коўдру, а ад думкі: «Ці не раскрылася малая, ці не замерзлі яе ножкі?».

Умець усміхнуцца, нягледзячы на тое, што ўсярэдзіне ты ўвесь на ўзводзе ад чарговых капрызаў, выплюнутай кашы ці расмазаных фарбаў. Усміхнуцца і з любоўю патлумачыць, чаму так рабіць нельга.

Навучыцца на хаду складаць калыханкі ці казкі, каб дачка магла заснуць пад гісторыю, у якой ёсць і яна, і яе ўлюбёная лялька, і іншыя зусім не чаканыя героі. Зразумець: калі проста так чысціць носік, то будзе істэрыка, а калі цётцы «ватнай палачцы» вельмі неабходна пазнаёміцца з «козамі», якія ў ім жывуць, то гэта зусім іншая справа.

Радавацца ранняму пад'ёму ў выхадны дзень, калі задоўга да сігналу будзільніка твой сон парушае гучнае: «Папуя».

Калі малая пачне рабіць першыя няўпэўненыя крокі, трымаючыся за тваю руку, усім сэрцам зразумець, што ты — яе апора: у гэтую хвіліну і на ўсё жыццё.

Адчуць небывалае пачуццё гонару, калі аднойчы заўважаеш на целе дзіцяці радзімку ў тым жа месцы, што і ў цябе. І недзе ў падсвядомасці ставіш яшчэ адзін плюсік у пераліку таго, чым вы падобныя.

Умець пабачыць у незразумелай мешаніне пластыліну бабулю, калі малеча сцвярджае, што зляпіла менавіта яе.

Не злавацца на чарговую шкоду, а вучыцца выпраўляць яе разам.

Аднойчы несці малое на руках і на павучанне, што неабходна «тупаць ножкамі», нечакана пачуць, што тату не цяжка. Спачатку рассмяяцца ад такой вынаходлівасці, а потым пагадзіцца, бо сапраўды, гэта вельмі прыемны цяжар.

Не баяцца быць смешным і «папіць» гарбату разам з лялькамі, альбо, не зважаючы на двухсэнсоўныя позіркі такіх жа бацькоў, забрацца разам з дачкой на дзіцячую горку, каб дапамагчы малой пераадолець страх і надаць ёй упэўненасці.

Навучыцца прызнаваць, што жонка дома, на гаспадарцы, можа стаміцца больш, чым ты на працы.

Калі аднойчы раніцай пасля твайго пацалунку дачка спачатку незадаволена складзе вусны, а потым пяшчотна правядзе маленькімі далонямі па тваім твары і выдасць: «Ты калючы!», падхапіцца і тэрмінова пагаліцца, нават калі не збіраўся гэта рабіць усе выхадныя.

Заўсёды адчуваць адказнасць і ў сітуацыях, калі неабходна прыняць складанае рашэнне, думаць, ці не будзе табе за яго сорамна перад дачкой.

Падчас дзённага сну дачкі навучыцца рабіць неабходныя справы амаль бязгучна, каб не страціць ніводнай хвіліны вольнага часу.

Насцярожыцца, калі на прапанову нешта зрабіць дзіця скажа: «Потым». Ці не з'яўляецца гэта адлюстраваннем тваіх паводзін? Быць больш уважлівым і на ўласным прыкладзе дэманстраваць, што адклад не ідзе на лад.

Засмуціцца, атрымаўшы ў канцы працоўнага дня тэрміновае заданне. Але не ад таго, што вымушаны затрацiць вольны час, а ад таго, што страціў вечар, які мог бы правесці з сям'ёй. Бо, калі прыйдзеш дадому, дачка будзе спаць, і ты застанешся без такога цёплага «сяпойнай ноці».

Умець адмовіць у яшчэ адной цукерцы, ад якой дакладна высыпле дыятэз, нават калі табе зазіраюць прама ў вочы, кажуць чароўнае слова «калі ласка», а потым пасля паўзы, быццам кантрольным стрэлам, яшчэ жаласліва дадаюць «трошачкі».

Быць татам — гэта зрабіць усё магчымае, аддаць усю душу, але не для таго, каб цябе любілі, а для таго, каб выхаваць чалавека, які будзе здольны любіць: шчыра і бескарысліва, як ты.

**Аляксандр АЛЕСІК** ■

# У МУЗЕІ ДЗЯЦІНСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Вольны доступ да цацак і адсутнасць шафаў не толькі дапамагае заняць больш месца непасрэдна пад экспанаты, але і спрыяе мабільнасці кампазіцый, тэматыка якіх будзе мяняцца.

*— Ствараючы музей, мы хацелі, каб дарослыя таксама крышку вярнуліся ў дзяцінства, таму і пачалі з лялек. Гісторыя лялек — гэта гісторыя ўсяго чалавецтва: развіцця касцюма, рэлігіі, узаемаадносін, з'яўлення прафесій. Праз гэтыя цацкі можна падаваць вялікі пласт інфармацыі па розных галінах, таму мы і хочам працаваць сумесна з настаўнікамі,* — кажа **стваральніца музея Галіна СЫРАКВАШ**, псіхолаг па адукацыі, якая сама доўгі час працавала з дзецьмі ў школе.

Лялек тут сапраўды шмат, і ўсе яны настолькі розныя па характарах, фактуры і здольнасцях, што ў кожнай зале можна правесці па гадзіне, хоць столькі адведзена на экскурсію па ўсім музеі. Ёсць механічныя, музычныя, васковыя, роставыя...

Асобныя экспанаты функцыянальныя, як драўляны Шчаўкунок з 30-40-х гадоў мінулага стагоддзя, які да гэтага часу лузае арэхі. А вось Акілу-агурэчніка — скрутак з пасмы нявырабленага льну і суконнай ніткі — клалі ў бочку з засоленымі агуркамі, каб не было цвілі.

Некаторыя цацкі маюць глыбокі філасофскі сэнс. Напрыклад лялькі-«пярэваратні», якія ў славянскіх традыцыях увасабляюць у сабе дзяўчыну, маці і бабулю, у амерыканскіх — супрацьпастаўленне негрыцянкі і белай жанчыны. Увогуле нашы лялькі традыцыйна рабіліся з анучак і нітак да рэлігійных свят. Напрыклад, Падарожніца, у якой хаваўся кавалак зямлі, давалася ў вандроўку. Траўніцай карысталіся для выгнання хваробы, а Дзесяціручку дарылі гаспадыні, каб яна ўсё паспявала. Ліхаманкі ўбіралі ў сябе ўсё нядобрае, што было ў хаце — потым іх разам з усім кепскім палілі ў печы.

**Драўляны Шчаўкунок з 30-40-х гадоў мінулага стагоддзя, да гэтага часу лузае арэхі.**

*— Абрадавыя статуэткі, у адрозненне ад сучасных цацак, вымушалі малых фантазіраваць,* — заўважыла Галіна Сыракваш, у якой адна з любіміц — просценькая лялька савецкіх часоў у ружовай сукенцы. — *Кожная лялька мае свой характар, бо майстры ўклалі ў іх душу. Я стаўлюся да іх як да стварэнняў хай і «адушаўлёных», але існуючых у іншым вымярэнні. Нездарма, слова «лялька», згодна са слоўнікам, адказвае на пытанне «хто?».*

Адной з першых цацак немаўляці ў нашых продкаў быў зайчык з анучкі, які нацягваўся малому на пальчык і быў яго забаўкай, сябрам і суцяшальнікам. Ён меў псіхалагічна-тэрапеўтычны эфект.

Казачныя ж персанажы — на асобным стэндзе. Яны спецыяльна не падпісаны, але за кожнай гераіняй стаіць адпаведная кніга. Тут вам і Папялушка, і Чырвоны Каптурок, Рапунцэль, Мэры Попінс, Герда, Аліса і іншыя. Для самых маленькіх выстаўлены героі мульцікаў.

Жыве тут і шарнірная марыянетка, якая кіруецца дваімі людзьмі, — стары з «Казкі пра рыбака і рыбку», зроблены беларускай лялечніцай Аляксандрай Паўлюкавец. Гэтая работа — дублікат, арыгінал жа разам з лялькай бабкі ўдзельнічаў у спектаклі лялечнага тэатра «Чаму старэюць людзі».



Цацкі, паміж якімі чатыры тысячагоддзі: шлем фантастычнага воіна з сучаснай гульні «Зорныя войны» і керамічная лялька (2-е тысячагоддзе да нашай эры; макет), знойдзеная на месцы старажытнага паселішча ў Кітаі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



На кухні, дзе Баба Яга гатуе казачныя напоі, мы заспелі захавальніцу музея Надзею Марфіну. Дзяўчына мае вышэйшую педагагічную адукацыю, што вельмі дапамагае ёй захапіць маленькіх экскурсантаў расповедамі пра казачных літаратурных герояў.

Вытанчаныя лялькі-рэплікі адноўлены па ўзору гістарычных цацак такімі вядомымі майстрамі, як Дон Руперт і Фрэдэіс Гэлеры. На прыкладзе гэтых экспанатаў відаць, што спачатку лялькам рабілі дарослыя твары, а іх адзенне цалкам адпавядала канонам тых часоў, калі дзяўчатак зацягвалі ў гарсэт і рабілі ім цяжкія прычоскі.

Пернікавы домік і пірог, зробленыя рукамі Надзеі Марфінай, адной з экскурсаводаў Музея дзяцінства, выглядаюць як сапраўдныя. Яна ж змайстравала хатку Бабы Ягі і гаршчок для чароўнага зелля, якое варыцца на пліце ў зале чарадзейных рэчаў. Побач — магічныя бутэлькі, дыван-самалёт і іншыя цуды. За вялікім сталом тут будуць правадзіцца заняткі, першай тэмай якіх стане выраб калядная анёлка.

Матэрыялаў, з якіх выраблялiся цацкі, мноства: воск, фетр, дрэва, ніткі, фарфор, пластмаса, спрасаванае пілавінне. Яны ўражваюць як сваёй прыродай, так і канчатковым вынікам. Напрыклад, італьянскія лялькі ленчы, створаныя ў 30-х гадах мінулага стагоддзя ўручную, зараз даволі рэдкія. Іх тварыкі абцягвалі фетрам, які паверсе размалёўвалі.

Ёсць у музеі і сучасныя канструктар «Лега», робаты і мяккія цацкі. З савецкай эпохі захавалася цацачная пліта, пральная машына, санкі і піяніна.

*— Малым цікава ўбачыць таксама знаёмыя і любімыя рэчы, а не толькі гістарычныя. А дарослыя ўспамінаюць сваіх цацачных сяброў з дзяцінства,* — расказала стваральніца музея. — *Для мяне дзяцінства — гэта самы шчаслівы перыяд, калі жывыя бацькі — твая апора, усе сябры яшчэ верныя, калі марожанага на рубель можна было купіць столькі, каб ужо не адчуваць яго смаку.*

У асобным пакоі дзяўчаты могуць пагуляць з сапраўдным домікам Барбі, а хлопчыкі —ператварыцца ў рыцараў і захапіць вялізны замак. А таксама сесці ў магічнае крэсла і загадаць запаветнае жаданне, якое абавязкова збудзецца.

**Ірына СІДАРОК.**

■ Добрая навіна

## Дзед Мароз узнагародзіў малых

**Сёлета свята сустрэчы Снягуркі і Матухны Зімы са шматлікай світай у маёнтку галоўнага беларускага Дзеда Мароза адзначана яшчэ адной падзеяй — узнагароджаннем пераможцаў конкурсу.**

Пушчанскі дзед цягам года праводзіў два творчыя конкурсы сярод сваіх прыхільнікаў. Дзеці прысылалі ў Белавежскую пушчу літаратурныя работы пра навагоднюю ёлку і цацкі, зробленыя сваімі рукамі. Удзельнікамі конкурсу сталі больш за тысячу хлопчыкаў і дзяўчатак з усіх куткоў Беларусі. Падчас цырымоніі Дзед Мароз прызнаўся, што гэта была складаная задача — вызначыць пераможцаў, бо школьнікі даслалі шмат добрых работ.

Але ж восем найлепшых атрымалі граматы і маляўнічыя альбомы пра пушчу, а таксама білеты на наведванне маёнтка Дзеда Мароза, вальераў і музея прыроды.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Нашым дзяцям

Маленькіх мінчан чакаюць падарункі ад горада

**Самае доўгачаканае і любімае дзятвой мерапрыемства — Галоўная ёлка краіны — пройдзе 24 снежня ў Палацы Рэспублікі. Свята наведаюць каля 1570 маленькіх мінчан, чакаюцца і міжнародныя дэлегацыі з гімназіі імя Францыска Скарыны з Вільнюса і гімназіі №23 з Рыгі.**

**Намеснік начальніка аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Надзея ВЯЛІКАЯ** расказала, што з 10 снежня і да 10 студзеня пройдзе традыцыйная рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці». Навінкай і сапраўдным святочным падарункам сёлета стане адкрыццё двух дзіцячых садкоў у Цэнтральным раёне: №32 і №28. Апроч таго, на базе ўстаноў адукацыі пройдуць навагоднія ранішнікі і святы. Надзея Вялікая паведаміла, што запрашаць у дзіцячыя сады прыватнага Дзеда Мароза можна толькі па ўзгадненні з кіраўніцтвам установы і бацькоўскім камітэтам.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** ■

■ Вазьму твой боль...

# ВАМ САПРАЎДЫ ПАТРЭБЕН СНЕГАВІЧОК?




**Інтэрнэт ускалыхнула гісторыя 4-гадовага Андрэйкі з Украіны, які лечыцца ад лейкозу ў беларускай клініцы і зарабляе на сваё лячэнне саморобнымі снегавічкамі. І паляцелі перапосты, пераказы. За першыя некалькі дзён малышу заказалі больш за 3000 цацак і пералічылі 5 з паловай тысяч долараў. Папулярнасць расце, збор ідзе, народ захапляецца. А ў мяне не атрымліваецца заміло́ўвацца гэтай гісторыяй. І я раскажу, чаму.**

Спачатку рука аўтаматычна пацягнулася да клавіятуры, каб папрасіць сабе снегавіка. Але моцны штуршок у грудзях спыніў. Мне сапраўды патрэбна цацка? Ды не, проста хачу дапамагчы хлопчыку. Дык дапамажы! Для чаго тады снегавік? Ён будзе прыгожа стаяць на стале і нагадваць, якую добрую справу я зрабіла.

У мяне столькі такіх напамінаў! Вось навагодняя зорка, зробленая рукамі 9-гадовага Жэні. Ён падарыў мне яе ў 2009-м. Праз шэсць месяцаў хлопчыка не стала. А я ўжо сёмы год сустракаю з яго зоркай. І кожны раз, перад святам дастаючы яе з шафы, узгадваю, якая я малайчына і як яму дапамагала.

Мы часта крыўляліся на фотакамеру, калі валанцёры і пацыенты збіраліся пагарэзіць у Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Потым я раздрукоўвала і дарыла ім фотакарткі. Дзіму, найлепшага сябра ў цэнтры, папрасіла падпісаць наш агульны фотаздымак. Мне на памяць, калі раз'едземся ці калі што... Картка праляжала ў яго цэлы тыдзень, але хлопец так і не падабраў слоў і вярнуў фота непадпісаным. Дзімкі не стала восем гадоў таму. А яго фотаздымак нагадвае мне пра адсутнасць надпісу, адсутнасць Дзімкі і пра тое, якая я цудоўная, што сябравала з ім.



З Андрэем мы хацелі пасадзіць дрэва. Проста ў двары анкацэнтра. Выкапаць у бліжнім узлеску і пасадзіць каля бальніцы. На памяць, калі ён папраўіцца, ці калі... Мы выбіралі месца, шукалі саджанец, здабывалі рыдлёўку. А потым яму стала горш. Мы так і не пасадзілі дрэва. Ён ужо ніколі не выгадуе сына і не збудуе дом. А я, кожны раз прыязджаючы ў бальніцу, шукаю вачыма месца, пустое месца, дзе не расце наша дрэва.

Не-не, я не пра сумную памяць. Вядома, ёсць і добрыя прыклады. Наш слаўны Міша, які лёгка і весела перанёс хваробу, у жыцці якога было шмат болю і здрады з боку дарослых, ад'язджаючы, пакінуў мне свае вырабы. Я перыядычна тэлефанавала яму, даставала з шуфляды аплікацыі, вазы з бісернымі кветкамі, вышыўкі. І ганарылася сабой.

Наш дабрачынны рух зараз збірае грошы для маладой спартсменкі з саркомай. Апарат для распрацоўкі нагі каштуе некалькі тысяч долараў. Былі артыкулы ў газетах, абвесткі на сайтах, посты ў сацсетках, некалькі дзясяткаў перапостаў... І толькі 500 тысяч беларускіх рублёў на рахунку.

Кожны дзень я атрымліваю лісты з пытаннямі, як зрабіць перавод, з адгаворкамі, што гэта складана, што трэба дайсці да пошты, банка, завесці электронны кашалёк, што нам варта было б спрасціць працэс дапамогі. І запаветныя капейкі не «капаюць» на рахунак былой спартсменкі, а яе мышцы дзервянеюць з кожнай секундай.

Але, як толькі на нашым гарызонце замаячыць «снегавічок», мы з радасцю дапамагаем, лёгка адрываем «пятую кропку» ад крэсла і хутка знаходзім спосаб перавесці грошы. Нам патрэбна аддача, напамін. Мы можам сабраць вялікую суму, абліваючыся ледзяной вадой і выстаўляючы відэа ў інтэрнэт. Мы можам набыць у «МакДональдсе» далоньку з надпісам «я дапамог дзецям». Але не можам проста ўзяць і дапамагчы дзецям. Не можам проста скінуцца і набыць апарат для спартсменкі. Не можам проста перавесці грошы на рахунак украінскага хлопчыка. Нам патрэбен за гэта медаль. Ці хаця б снегавічок...

У рамках падтрымкі падапечных «Клуба 5000» мы ладзілі чарговы дабрачынны аўкцыён. Стаўкі рабілі неахвотна, хоць стартавы кошт быў мінімальны, а рэчы прадавалі прыгожыя. Ну хто яго ведае, можа, крызіс уплывае. Пасля вялага продажу мы пачалі збірацца дадому. І якое ж было дзіва, калі да скарбонкі клуба з усіх канцоў залы паплылі людзі. Яны пакідалі ахвяраванні і дзякавалі за працу. Мы ўпершыню бачылі, як «дзівакі» адмаўляліся набыць унікальнае ўпрыгожванне за 50 тысяч, а потым проста кідалі ў скарбонку 100.

Урок аўкцыёну навучыў мяне па-іншаму ставіцца да «снегавічкоў». І так стала прыкра ад назапашаных напамінаў і свайго гонару! Цяпер на дабрачынных кірмашах я набываю толькі тое, што сапраўды патрэбна. А дапамогу пералічваю без усялякіх доказаў і бонусаў. Мішкавы вырабы раздала знаёмым. Сшытае ім сонейка адправілася аж но ў Італію. Там віс іць над ложкам, саграваe аднаго добрага чалавека і грэе самога Мішку думкай пра яго італьянскае сонейка.

Вам сапраўды патрэбен снегавічок? Я ведаю, што гэта прыцягвае больш увагі, чым проста просьба дапамагчы, ведаю, што ім лягчэй прасіць, аддаючы нешта ўзамен, што творчасць дапамагае адцягвацца ад хваробы. Але гэта ўжо іншая гісторыя. А Андрэйку сёння не да снегавікоў. Мы можам даць магчымасць яго матулі падарыць час сыну, а не вырабам. Мы можам даць ім адпачынак замест чаргі на пошце. Мы хочам яму дапамагчы, а не набыць сабе снегавіка. І зрабіць гэта не так складана, як здавалася.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■ Людзі і лёсы

# НАВАЛЬНІЦА

НА філалагічным факультэце педінстытута Ніна вучылася завочна, у Мінск прыехала ненадоўга, на летнюю сесію, але звыкнуцца з шумным, мітуслівым горадам ніяк не магла. Яна адчувала сябе мурашкай, невядома як закінутай у мураваныя джунглі: сумавала па доме, па сябрах, па сваім невялікім утульным гарадку.

Гэта была яе першая пераводная сесія. Экзамены яна здавала паспяхова, бо рыхтавалася да іх дома ды і тут, у студэнцкім інтэрнаце, таксама. А пасля лекцый хадзіла... да свайго аўтобуса, на вакзал: у надзеі спаткаць знаёмых блукала па пероне, іншы раз некага бачыла, размаўляла, але нікому не прызнавалася, чаму яна тут. Баялася, што пасмяюцца з яе дзівацтва.

Аднойчы, вяртаючыся з вакзала, яна трапіла пад дождж. Дажджы яна любіла з маленства. Тады за шчасце было прамокнуць да ніткі, прабегчыся басанож па цёплых лужынах, а калі праясніцца, з намоклага пяску наляпіць «піражкоў».

Цяпер жа, каб не прамокнуць, яна заскочыла ў тэлефонную будку.

І туды ж, следам за ёй, віхурай уляцеў высокі чарнявы хлопец.

— Віця?! Ты не з неба зваліўся? — ахнула ў здзіўленні дзяўчына. — Вось дык сустрэча!

І сапраўды нечаканая, бо некалі яны вучыліся ў адным класе, ніякіх сімпатый адно да аднаго не мелі, а таму пасля школы разышліся, як у моры караблі. Здавалася, назаўсёды. Аж не: тут, у гэтым чужым горадзе, яны вельмі ўзрадаваліся адно аднаму, сталі размаўляць, успамінаць нейкія школьныя эпізоды, распытваць, хто чым займаецца...

Хмара тым часам палягчэла, пасвятлела і паплыла далей. У небе заззяла вясёлка. Вочы хлопца і дзяўчыны ззялі таксама.

Віктар праводзіў Ніну да інтэрната, і з таго дня яна ўжо «забылася» дарогу на вакзал, — стала бегаць на спатканні.

Хлопцава навучанне на курсах і яе сесія закончыліся аднАчасова — у родны горад яны вярталіся разам.

Паўгода яшчэ сустракаліся там, а зімой згулялі вяселле. Віктар быў яе першым каханнем і, захопленая пачуццём, Ніна шмат чаго ў ім не заўважала. А вось яе мудрая мама не знаходзіла сабе месца, угаворвала не спяшацца, прыглядзецца да абранніка. Але ж хто ў маладосці слухае бацькоў?

ПЕРШЫ трывожны званочак празвінеў яшчэ ў мядовы месяц — муж «замачыў» з сябрамі прэмію, прычым так, што ледзьве прыпоўз дадому. «Прабач. Не разлічыў сілы», — вінаваціўся раніцай і абяцаў, што такое больш не паўторыцца.

Паўтаралася. Прычыны знаходзіліся розныя. Ніна плакала, прасіла, злавалася — усё як аб сценку гарох. Спадзявалася хіба на тое, што з'яўленне дачушкі ці сына надасць яе любаму сіл не «ўваліцца» ў багну п'янства.

У радзільню Віктар і сапраўды прыйшоў з ружамі, цалаваў ёй рукі, кляўся ў каханні, абяцаў залатыя горы.

Наступным вечарам, чакаючы мужа, маладая мама чапурылася перад люстэркам — на змарнелым твары падводзіла алоўкам бровы, фарбавала вейкі і вусны.

— Дарэмна стараешся, маладзіца, — бесцырымонна пагасіла яе радасць санітарка. — Выглянь у акно. Ляжыць твой Віцька на лаўцы — п'яны, што цэп... Мала не дайшоў, небарака.

— Нінaчка, гэта апошні раз. Усё, завязваю, — кляўся потым, працверазеўшы, Віктар.

Але «завязаць» ну ніяк не атрымлівалася!

Сынку іх споўнілася тры гадкі, калі жонка вырашыла падаць на развод.

Такое рашэнне, здавалася, працверазіла мужа. «Не рабі гэтага, Ніна, — прасіўся ён. — Максімку патрэбен тата. Хутка паеду ў Расію на заработкі, адарвуся ад дружбакоў, што падбіваюць на п'янкі, зараблю нам грошай. Ты засумуеш па мне, і ўсё наладзіцца.

Прайшлі тры месяцы. Ніна і сапраўды засумавала... Віктар жа, перапоўнены гонарам, прывёз дзве тысячы долараў і аддаў жонцы. Ночку яны былі адным цэлым. А раніцай муж пайшоў у краму па прадукты і вярнуўся, ледзь трымаючыся на нагах.

Назаўтра — з хворай галавы — яму захацелася піва. Жонка ўзялася сварыцца: маўляў, што гэта такое? Зноў ты за сваё, за старое? «Абражаны» муж тут жа ўскіпеў: «Ах, я дрэнны, няварты цябе? Аддавай грошы!» Нядоўга думаючы, Ніна шпурнула стос зялёных паперак: «Забірай! І каб нагі тваёй тут болей не было!»



**Карціна Канстанціна Макоўскага «Дзеці, якія бягуць ад навальніцы»**

Пасля гэтага яна ўвесь дзень праплакала. Шкадавала сябе, што звязалася з п'яніцам, шкадавала сынка, які застаецца без бацькі.

Ужо ноччу правалілася ў цяжкое трывожнае забыццё і не адразу зразумела, ці сон гэта, ці ява: незавешанае акно паласавалі маланкі, дзесьці побач, амаль не сціхаючы, білі перуны... Рабінавая ноч!

Ніна ўключыла святло. Гадзіннік паказваў тры. Больш яна не заснула ні на хвілінку. І слёз ужо не было.

Раніцай Віктар не вярнуўся. Не прыйшоў ён і ў наступныя дні. Сяброўка сказала Ніне, што якраз тым вечарам бачыла яго, моцна п'янага, на беразе ракі. «Утапіўся!» — працяла здагадка.

Не злічыць, колькі разоў да гэтага Віктар, п'яны, лез у ваду: яна цягнула яго нібыта магніт! Вось і ўцягнула, відаць?

Ніна не знаходзіла спакою, дакарала сябе за жорсткія словы, у думках ужо хавала яго.

А «нябожчык» між тым быў жывы-здаровы. Ён з'явіўся праз дзесяць дзён — брудны, прапіты, нахабны.

Як высветлілася, увесь гэты час ён правёў у жанчыны. А скончыліся грошы — стаў непатрэбны і ёй.

Ніну калаціла ад злосці і агіды. Яна сабрала мужавы рэчы, выставіла іх за дзверы. Выштурхала туды ж і яго самога: не адкладваючы ні на дзень, падала на развод.

На шчасце, Віктар быў прапісаны ў кватэры сваіх нябожчыкаў-бацькоў. У ёй і пасяліўся.

МІНУЛА пяць гадоў. Замуж Ніна больш не выйшла, хоць прапановы рукі і сэрца былі. Яна любіла сваю работу, цешылася з сынка, даражыла сваёй свабодай і спакоем.

Віктар жа, уволю нацягаўшыся па жанчынах, адну з іх прывёў у бацькоўскі дом. Разам пілі-гулялі, біліся і мірыліся. Сужыцелька яго не працавала ніколі, ён сам — уладкоўваўся і звальняўся (найчасцей — па волі наймальніка), а потым і зусім апынуўся на вуліцы: збіраў бутэлькі, рыззё, паперу — не столькі на ежу, колькі на пітво. Без алкаголю не абыходзілася ні дня.

А ў выніку... Гэта не магло не адбіцца на яго здароўі. Адным познім ліпеньскім вечарам Ніне патэлефанавала яе былая суседка, якая працавала медсястрой у рэанімацыі.

— Тут у нас твой былы... Здаецца, канае. Просіць, каб ты прыйшла. Можа, хоча пакаяцца?

— То няхай перад Богам... — уздыхнула Ніна. — А я даўно яму ўсё даравала. І пахавала яго даўно — у тую рабінавую ноч, калі з дому пайшоў з грашыма.

Яе сэрца — спагадлівае да любога гора — на гэты раз засталося глухім.

І сыну пра смерць бацькі яна не сказала, бо хлопчык тату зусім не памятаў. Той ніколі не цікавіўся малым, нічым яму не дапамог.

УПРЫРОДЗЕ ўладарыла лета. Праз адчыненае акно спальні п'яніў мядовы пах квітнеючай ліпы. У агародчыку раскашавалі пяшчотныя лілеі. Ніна ўзяла ў рукі кнігу, але ніяк не магла засяродзіцца — насуперак волі яе думкі вярталіся ў Мінск, у той нечаканы дождж і навальніцу, у выпадковую сустрэчу з Віктарам, і вялі далей па іх сумесным, часцей бязрадасным жыцці.

Рэзкі парыў густога, набрынялага ветру грукнуў аконнай рамай. Ніна зачыніла акно і выйшла на ганак. Зноў набліжалася навальніца.

**Фаіна КАСАЦКІНА,**
*г. Паставы*

# «ВЯЛІКАГА ДУБА З МАЛЫМ КАРЭННЕМ НЕ БЫВАЕ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

**Жанчыны часта перашкаджаюць** прагрэсу сваіх мужчын. У асноўным, калі не падтрымліваюць яго рызыку. Напрыклад, мой бацюшка ў свой час адмовіўся ад фіксаванай зарплаты і сышоў будаваць храм. Іншая магла б спалохацца, сказаць: «Падумай пра дзяцей!» І загасіць мару. Але я мужа падтрымала. Бо лічу: калі мужчына не зробіць, што павінен, калі не будзе рызыкаваць, змагацца, увасабляючы мары ў жыццё, — ён будзе ўвесь час нервавацца і дэпрэсаваць. А то і зусім можа апусціцца ў мужчынскія заганы...



**Пакуль мы размаўлялі, матушка Вера паспела з малодшай дачкой наляпіць варэнікаў з капустай.**

**Незадаволены мужчына** — гэта міна запаволенага дзеяння. Калі ён адчувае, што не рэалізаваўся, то пачынае шукаць праблемы ў жонцы ці ў дзецях. І ад гэтага будуць пакутаваць усе. Таму лепш няхай тата будзе шчаслівы.

## Пра выпускны баль, цнатлівасць і сачавічны суп

**Я вучылася ў жаночай гімназіі.** Калі прыйшоў час выбіраць кавалера для выпускнога балю, звярнулася да Пашы. Я яго ведала з дзяцінства, ён жыў у суседнім двары. З таго балю і пачалося наша сяброўства. Я спявала ў царкоўным хоры, і Павел часта мяне праводзіў, сустракаў. Аднойчы мой духоўнік сказаў, каб я запрасіла свайго маладога чалавека зайсці ў царкву. Да сустрэчы са мной ён не быў уцаркоўлены.

**Маім бацькам было важна**, каб я атрымала адукацыю і захавала цнатлівасць да шлюбу. Калі я прыйшла з маладым чалавекам дадому, мама з татам адразу запыталіся: «Калі вяселле?». Праз месяц яны зразумелі, што мы не збіраемся расставацца, і пайшлі знаёміцца з Пашынымі бацькамі. Думаю, гэтая пазіцыя паўплывала на тое, што ў нас з сястрой моцныя сем'і. Ужо нават даказана, што, калі да шлюбу ў жанчыны быў адзін партнёр (нават калі гэта той чалавек, за якога яна выйшла замуж), устойлівасць сям'і зніжаецца з 80 да 54%.

**Большасць жа сямейных сцэнарыяў** маюць установку на грошы, на «нагуляцца да вяселля» (а не на адказнасць за зачатае дзіця), на «колькі іх яшчэ ў цябе будзе» (а не на вернасць і цнатлівасць), на «прынясеш у падоле — заб'ю», «наш сыночак добры, гэта ваша дачка прыдбала, і наогул, гэта не ад яго дзіця». Часта пасля лекцый да нас падыходзяць дзяўчаты і прызнаюцца, што валанцёры «Матулі» — першыя дарослыя, якія кажуць ім пра цнатлівасць і вернасць як норму, абавязковую ўмову для шчасця ў сямейным жыцці.

**Дзеці нас з мужам называюць на «вы»**. Гэта свядомая пазіцыя. Перанялі мы яе ў адной украінскай святарскай сям'і. Калі чую, як чужыя дзеці на сваіх бацькоў павышаюць голас, — мне робіцца неяк не па сабе. Сказаць «мама — вы дура», пагадзіцеся, гэта вельмі пяшчотна гучыць *(усміхаецца)*.

**Пост — рэч добраахвотная.** Нашы дзеці ў школе не посцяць. Лічу няправільным абавязваць іх ісці супраць усяго калектыву толькі таму, што бацькі так вырашылі. Дома ў пост мы мяса не ядзім. Кажуць, навучы дзяцей утаймоўваць чэрава, і яны, калі вырастуць, змогуць утаймоўваць жарсці. Гэта праўда. Я сама расла ў веруючай сям'і. Мы заўсёды рыхтаваліся да свята, пасцілі. Для мяне гэта вельмі трапяткія, сакральныя ўспаміны.

**Некалькі гадоў таму** я нават выдала памятку «Святочны пост з матушкай Верай». Сабрала там рэцэпты посных страў «на хуткую руку». Мае дзеці, напрыклад, любяць суп з сачавіцы, я вельмі рада, бо гэта раслінны бялок. Наогул мы аддаём перавагу простай ежы. Але гэта не значыць, што ў нас аднастайнае меню. Я раблю за адзін раз кучу нарыхтовак-заправак для каш, блінчыкаў, варэнікаў — падсмажаныя моркву з цыбуляй, капусту з грыбамі, адвараныя бурачкі... Ва ўсіх розныя густы.

**Я з дзяцінства наведвала царкву**, і для мяне гэта была душэўная патрэба. Бачу, што ў маіх дзяцей пакуль — не. Хоць у ідэале я, вядома, хацела б іншага. Мы жывём далёка ад прыхода, дзе служыць мой муж. На іншым канцы горада. Калі дзяцей было трое, то мы штотыдзень іх вазілі на службу. Пяцярых складаней арганізаваць (сабраць, адзець). А мне вельмі не хочацца, каб паход у царкву ўспрымаўся не як свята, а як стрэс для ўсіх. Разам з тым дзеці не пазбаўлены задавальнення слухаць нашы з мужам рэлігійныя размовы. Любяць, калі я ім апавядаю розныя біблейскія гісторыі.

## Пра пасляродавую дэпрэсію, зацяжны дэкрэт і Ваню, якому напляваць

**Пасля першых родаў** я перажыла дастаткова адчувальны крызіс, бо не змагла выкарміць дзіця грудным малаком. У мяне ўпала самаацэнка. Я такая ўся разумная (аспірантка) і духоўная (жонка святара) — і аказалася зусім не гатовая ні да малога, ні да сябе — такой стомленай і дэпрэсіўнай. І я пачала шукаць, дзе б мяне зразумелі і дапамаглі. Такога месца не знайшла, таму стала ствараць яго сама. Так пры нашым прыходзе з'явіўся цэнтр «Матуля».

**Падтрымліваючы іншых мам**, знаходжу адказы і на свае пытанні. Жанчыне ў такім зацяжным дэкрэце, як у мяне, не выпадае чакаць, калі ён скончыцца, для ажыццяўлення сваіх мар. Прыходзіцца вучыцца сумяшчаць. Балазе, у мяне цудоўныя бацькі, свякроў, сястра, выдатны муж, якія бяруць частку клопатаў пра дзяцей на сябе (дарэчы, для гэтага жанчыне трэба быць пакорлівай і ўдзячнай). Недарэмна кажуць, што вялікага дуба з малым карэннем не бывае.

**Мы не толькі дапамагаем так званым «крызісным цяжарным».** Ставім перад сабой больш глабальную задачу — аднаўленне культуры мацярынства. У прыватнасці, абучаем пары сімптом-тэрмальнаму метаду распазнання пладнасці. Сутнасць у тым, што ў працэсе назірання за сабой і сваім арганізмам жанчына разумее, калі яна можа зацяжараць. І яны з мужам удвух прымаюць рашэнне: мы ўстрымліваемся цяпер ці ідзём на магчымасць зачацця.

**Адзін святар,** слухаючы маю лекцыю, усклікнуў: «Як жа я змагу ў сябе ў вёсцы расказаць пра метад, калі «Ваню» напляваць, што ў «Мані» плодныя дні і ўжо 6 дзяцей — ён выпіў і патрабуе ад жонкі выканання сужэнскіх абавязкаў». І гэта, на жаль, горкая праўда! Як можна пасля такога гаварыць пра сям'ю як малую царкву?

**У Евангеліі ад Матфея мяне заўсёды кранала** тое, як пісалася радаслоўная Ісуса: Абрам нарадзіў, Ісак нарадзіў... Цяпер рэдка можна знайсці пару, у якой клопаты пра дзяцей і рашэнні пра іх колькасць нясе не толькі жонка, але і муж. За ім толькі катэгарычнае патрабаванне аб аборце ці выкарыстанні сродкаў кантрацэпцыі, якія проста калечаць жанчыну.

**Нікому не трэба даказваць**, што пазбаўленне жыцця чалавека, якому некалькі гадзін ад зачацця — забойства. А гэта ж адбываецца пры выкарыстанні спіралі, гарманальных таблетак, кольцаў, імплантантаў. А многія жанчыны пра гэта і не падазраюць. І няхай вытворцы і гінеколагі пераконваюць у адваротным — пачытайце інструкцыі: у кожным з гэтых сродкаў ёсць функцыя: «прадухіленне магчымасці імплантацыі пладнага яйка ў эндаметрый». А гэта і ёсць аборт. Маецца і іншая група — неабартыўных кантрацэптываў: мазяў, геляў, прэзерватываў. Гэтыя метады не забіваюць зачатага, але не бясшкодныя. Некаторыя з іх уплываюць на здароўе жанчыны (а адпаведна — і на яе будучых дзяцей), мяняючы яе гарманальны фон, пагаршаючы флору. Самае разумнае — устрымлівацца ў тыя дні, калі жонка можа зацяжараць.

## Пра небяспечныя дні, «залётную» цяжарнасць і дзіця з батонам

**Думала, маладыя сем'і ўзрадуюцца** і пабягуць да мяне вучыцца гэтаму метаду. Але ў асноўным прыходзяць пары з паніжанай пладнасцю, якія хочуць стаць бацькамі (па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, метад распазнання пладнасці дазваляе адчуць шчасце мацярынства і бацькоўства 80-ці парам са ста). На жаль, часта вельмі позна. Калі яны ўжо прапілі гарманальныя, схадзілі на некалькі ЭКА. Я ўжо стала адразу на першай лекцыі гаварыць пра ўсынаўленне. «Можа, Гасподзь дасць вам дзіця пасля ўсынаўлення, але ж вы не страціце час». Нядаўна прыходзіла жанчына, якая 5 ЭКА зрабіла. Ды за гэтыя грошы яна магла б 10 гадоў таму ўсынавіць дзіця і штолета ў Егіпет усёй сям'ёй ездзіць адпачываць.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Айцец Павел, які вярнуўся з працы не з пустымі рукамі, ніяк не чакаў у такі позні час убачыць у сваёй кватэры журналістак... Але, як бачыце, не разгубіўся.**

**Царква дрэнна ставіцца да ЭКА.** У жанчыны бяруць 10-20 яйцаклетак, і ўсе апладняюцца. Падсаджваецца ж ад двух да шасці. Што адбываецца з астатнімі? Яны ці замарожваюцца (або ідуць на доследы), ці проста выліваюцца ў каналізацыю! Але ж гэта ўжо дзеці, хоць яшчэ зусім маленькія. Царква не можа такое бласлаўляць. Не кажучы ўжо пра рэдукцыю, калі з ужо падсаджаных дзяцей, якія прыжыліся ў маме, адбіраюць жаданую колькасць, а астатніх забіваюць.

**Калі падчас цяжарнасці майму дзіцяці паставілі падазрэнне на сіндром Даўна,** муж сказаў: «Будзем нараджаць, ён што — не ад Бога, ці што?» Словамі не перадаць, што я перажыла ў першыя гадзіны. А потым мяне асяніла простая і грандыёзная думка: усё ў руках Божых, і, вядома, — жыццё майго малога. Мая справа не працівіцца Яго волі, а аказаць новаму чалавеку, які б ён ні быў і які б маленькі тэрмін у мяне ні гасціў, годны прыём. Дзякуй Богу, дзіця нарадзілася здаровенькім. І я вырашыла, што больш на раннюю дыягностыку не пайду. Не хачу, каб дзіця атрымлівала з маёй крывёй негатыўныя гармоны, якія будуць блакіраваць яго развіццё.

**На жаль,** па-ранейшаму «а можа ды няхай (праняcе)» — нашыя галоўныя богі. Цяжарнасці ў нас «залётныя»; дні, у якія жанчына можа зацяжараць, — «небяспечныя»... А пасля гэтага мы яшчэ здзіўляемся, калі чуем, што ў Беларусі штодня забіваецца ў матчыным чэраве ў сярэднім 101 дзіця...

**Займаючыся перадабортным кансультаваннем,** размаўляючы з мамамі-татамі-бабулямі-дзядулямі, якія хочуць адмовіцца ад дзіцяці-ўнука, я заўважыла ў іх поўнае знясіленне любові. У людзей не толькі для іншых, для сябе няма энергіі! Але сакрэт у тым, што з дзіцем Бог дае і рэсурс. Ёсць жа прыказкі «Калі дзіця на свет прыходзіць — новы кусок хлеба родзіць» і «Кожнае новае дзіця прыходзіць з батонам пад пахай». Гэта не толькі матэрыяльныя даброты, гэта і рэзерв любові для бацькоў.

**Калі мама прывяла дачку на аборт,** у нас, псіхолагаў, шанцаў няма. Гэта муж можа не разумець, што такое аборт і якую траўму атрымае жанчына. Калі ён яе кахае, то хутчэй за ўсё перагледзіць сваё стаўленне. Маці ж нічога і слухаць не хочуць, гавораць, як мантру: «Я гэта перажыла — значыць, і ты перажывеш». Такая вось сямейная абартыўная традыцыя...

**Жанчынам, якія не могуць зацяжараць** пасля таго, як зрабілі аборт, трэба пакаяцца. Акрамя таго, каяцца трэба і тым, хто прымаў гарманальныя кантрацэптывы, або ўжываў ўнутрыматачную спіраль. Бо, як я ўжо казала, гэта абартыўныя сродкі, а аборт — смяротны грэх. Таксама вельмі часта бывае, што жанчына не можа зацяжараць, а потым аказваецца, што яе маці калісьці рабіла аборт. Тады і маці павінна пакаяцца. Бо на духоўным узроўні дачка можа расплачвацца за яе грахі.

**...Як я стаўлюся да касметыкі?** Я ж не магу сказаць, што дрэнна, вы ж бачыце, што сама цяпер трошкі падфарбаваная *(усміхаецца)*. Калі я прыходжу да чыноўнікаў у доўгай спадніцы ў вобразе кормячай маці з гулькай, мяне проста не бачаць і не чуюць. Таму я на працы пачала карыстацца касметыкай і насіць больш свецкую вопратку. Жанчына створана для таго, каб упрыгожваць сусвет, гарманізаваць прастору вакол сябе. І калі ёй у гэтым дапаможа касметыка і прыгожае адзенне — чаму не?

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Добрая справа

# «КаліЛаска»: СТАРЫЯ РЭЧЫ ПА НОВАЙ ЦАНЕ




**Разбіраючы завалы на балконе, знайшла новенькія боты, якія не падыходзяць ні мне, ні знаёмым. Што рабіць? Можна знайсці ім гаспадара праз суполку «Аддам дарма». Альбо, прыхапіўшы пару непатрэбных рэчаў, завітаць на продаж беларускага дабрачыннага праекта па зборы і перадачы адзення ў сацыяльныя ўстановы «КаліЛаска». Не з пустымі рукамі адпраўляемся на лістападаўскі «сэйл».**

Гісторыя развіцця дабрачынных крам (чэрыцішопаў) пачалася прыкладна стагоддзе таму ў Вялікабрытаніі. У Беларусі ж першы праект такога кшталту з'явіўся ў 2013 годзе. «КаліЛаска» існуе без грантаў і ахвяраванняў і акупляецца толькі за кошт рэалізацыі невялічкай часткі сабраных рэчаў. Гэта не дабрачыннасць у чыстым выглядзе, а хутчэй яе прагрэсіўная форма — сацыяльнае прадпрымальніцтва. У Беларусі кірунак пакуль што слаба развіты. За два з паловай гады працы валанцёры «КаліЛаска» сабралі і перадалі ў розныя сацыяльныя ўстановы больш за 35 тысяч тон адзення.

— Для продажу мы выбіраем літаральна адзін працэнт самых цікавых пакупнікам рэчаў, — тлумачыць **заснавальніца праекта Алеся ПЧОЛКА.** — У сацыяльных установах ёсць патрэба ў цёплых світарах, куртках, джынсах. Не думаю, што там чакаюць туфлі на абцасах ці вячэрнія сукенкі. Такія рэчы знойдуць новага гаспадара ў краме.

Сама Алеся стараецца жыць экалагічна, таму для яе цалкам нармальна набыць вопратку ў «сэкандзе» альбо дабрачыннай краме.

— У старэйшага пакалення засталася звычка захоўваць старое адзенне, нават тое, што паела моль. Беларусы пакуль не навучыліся лёгка ставіцца да рэчаў, — разважае Алеся. — Так, у Еўропе блышыныя рынкі, барахолкі — гэта норма. А ў нас — нешта звышардынарнае. Нават калі ў людзей няма грошай, яны хучэй аддадуць усю зарплату, але набудуць куртку, якая, можа, і не вартая тых сродкаў. Але ў «сэканд» ці ў дабрачынную краму не пойдуць.


За кошт сезонных продажаў «КаліЛаска» самаакупляецца.

Алеся разабралася, як працуюць чэрыцішопы ў Еўропе і вырашыла зрабіць нешта падобнае ў Мінску.

— Раней я займалася фатаграфіяй на прафесійным узроўні, але ў нейкі момант прадала ўсю тэхніку і вырашыла ўкласці грошы ў карысную справу.

Продажы ў Алесінай дабрачыннай краме адбываюцца раз на сезон. Большая частка прадметаў адзення каштуе 50 тысяч рублёў, максімальны кошт не перавышае 300 тысяч. Акрамя «сэйлаў», «КаліЛаска» праводзіць «дрэс-кросінгі»: людзі прыносяць рэчы, за кожную валанцёры выдаюць ім талон, які можна абмяняць на любую рэч. Насамрэч, гэта вельмі просты спосаб абнавіць гардэроб. Сама ідэя прыйшла з Вялікабрытаніі, калі некалькі сябровак стаміліся ад вялізных шафаў, перапоўненых адзеннем, сабраліся разам і памяняліся.

Мінімальныя патрабаванні да рэчаў выканаць няцяжка: рэчы мусяць быць у добрым стане, без плям, дзірак, з працоўнымі «маланкамі». Бываюць і выключэнні: напрыклад, мужчынскага адзення заўжды не хапае, таму валанцёры забіраюць рэчы з невялікімі «паграшнасцямі». Тут стараюцца па максімуме выкарыстоўваць усё, што да іх прыносяць. Рызё адпраўляецца на падсцілкі для жывёл у прытулак.

— Мяне вельмі кранае, калі ў офіс прыязджаюць бабулі з іншага канца горада толькі для таго, каб перадаць кофтачку. Цудоўна, што людзі знаходзяць у сабе сілы зрабіць нешта карыснае, — кажа Алеся. — Забяспечаныя сем'і прыязджаюць на вялікіх машынах і выгружаюць кучы каробак. Гэта зручна: чалавек можа сабраць усё непатрэбнае ў вялікі мех, а мы пасля адсартуем і адправім адзенне ў розныя арганізацыі.

Рэчы жывуць да той пары, пакуль імі карыстаюцца. Калі ў вас пыліцца непатрэбнае адзенне, цацкі, сувеніры — прыносьце іх у дабрачынныя крамы, дзе яны атрымаюць другое жыццё. Зараз «КаліЛаска» прымае рэчы ў першую суботу кожнага месяца па адрасе: Мінск, пр-т Машэрава, 9, пакой 111.

**Кацярына РАДЗЮК.**
**Фота Надзеі БУЖАН і з архіва Алесі ПЧОЛКІ**

■ Вусы, лапы, хвост

# СЮРПРЫЗ У ПАНЦЫРЫ

## Чаму можна павучыцца ў чарапах?



**Яны жывуць у сваім свеце і часта «замыкаюцца» ў сабе. Іх параўноўваюць з маленькімі дыназаўрамі і неабгрунтавана называюць павольнымі. Чарапахі не з тых свойскіх жывёл, якія «калі прыходзіш з працы, табе рады», як калісьці сказаў паштальён Печкін. Дык чаму ж тады людзі заводзяць маўклівых, закаваных у «браню», рэптылій? Са сваімі гадаванцамі — чырванавухімі чарапахамі Феняй і Марцінам — знаёміць Вольга АСТАПОВІЧ.**

### Як Марта стала Марцінам

Чарапашкі жывуць у Волі ўжо год. Яны трапілі ў новы дом зусім маленькімі і спачатку нагадвалі дзве капеечкі. Цяпер панцыры Фені і Марціна ў даўжыню амаль 10 сантыметраў (максімум для гэтага віду складае 20-25 сантыметраў). Нядаўна здарыўся адзін канфуз, які даказаў: з імёнамі для гэтых земнаводных лепш не спяшацца, бо іх пол можна вызначыць толькі пасля першага года жыцця. Так Марціна напачатку прынялі за самку і назвалі Мартай. Чым не сюрпрыз для гаспадыні?

— Па прагнозах меркавалася, што большая па памерах — гэта самка, бо ў прыродзе яны значна буйнейшыя за самцоў, хутчэй растуць і развіваюцца, — тлумачыць дзяўчына. — Аказалася наадварот. Магчыма, і Феня самец, пакуль гэта выявіць цяжка. Яны адрозніваюцца ад самак больш доўгімі кіпцюрамі і тоўстым хвастом. Калі патрывожыць іх спакой, яны стануць паводзіць сябе агрэсіўна: могуць укусіць і падрапаць. У мяне няма планаў атрымаць ад маіх выхаванцаў патомства, хоць калегі жартуюць: калі з'явяцца чарапашаняты, мы іх разбяром, — смяецца дзяўчына. — Увогуле, развядзенне чарапах — працэс складаны і адказны. Жывёл трэба ўводзіць у анабіёз, паніжаць тэмпературу вады, каб у іх запавольваліся працэсы ў арганізме. Ёсць вялікая рызыка, што неспецыяліст няправільна правядзе працэдуру і чарапашкі не прачнуцца.

Дарэчы, у штучных умовах, якія дазваляюць стварыць камфортную тэмпературу для жыццядзейнасці, рэптыліі не ўпадаюць у спячку.

### Сонечныя ванны ля «грыбка»

Чарапахі — жывёлы непераборлівыя. Дастаткова адзін раз стварыць для іх добрае асяроддзе, і пасля можна асабліва не турбавацца. Феня і Марцін жывуць у невялікім акварыуме. Абагравальнік падтрымлівае ў ім неабходную тэмпературу ў 27-28 °С. Устаноўлены фільтр для вады. Замест падлогі — галька, «канапы» замяняе невялічкі астравок з каменю, які Воля называе «грыбком». Чырванавухія чарапахі напаўводныя-напаўсухапутныя жывёлы, таму без кавалачка «зямлі» не абысціся. У акварыуме два «сонцы» — адна лямпа прызначана для сонечных ваннаў, якія дапамагаюць выпрацоўцы вітаміну D, другая свеціць удзень.

— Спадзяюся, хутка мы будзем пашырацца, бо гэты акварыум чарапашкам ужо ўпрытык, — адзначае дзяўчына. — Даводзілася чуць такія думкі, нібыта, калі ім дастаткова вады для таго, каб пераварочвацца, то пашырацца неабавязкова. На мой погляд, той, хто насамрэч клапоціцца пра сваіх гадаванцаў, гэтага не дапусціць. Для камфортнага пражывання адной чарапашцы неабходна ад 40 да 100 літраў вады. Калі жылплошчу павялічыць, то яны будуць расці хутчэй.

Прыкладна раз на тыдзень у акварыуме трэба чысціць фільтр і мяняць ваду, пакідаючы адну трэцюю частку, што дазваляе падтрымліваць натуральнае асяроддзе. Мыць акварыум неабходна раз на месяц. На дно лепш насыпаць натуральную гальку і не дабаўляць ракавінак, якія робяць ваду менш прыдатнай для жыцця чарапах. Воля папярэджвае: цяпер прадаецца шмат штучнай «падлогі». Але адшліфаваных каляровых каменьчыкаў і шкла лепш пазбягаць.

### Айбаліт для «будзільнікаў»

Словы аб тым, што чарапахі ядуць сырую капусту і моркву, Воля лічыць міфам. У рацыёне драпежніц мусіць быць сырая несалёная нятлустая рыба. Кілаграма свежамарожанага хеку ці мінтая парачцы чарапашак хапае на 7 месяцаў.

— Увогуле маленькіх тарціл (меншых за 10 см) кормяць адзін раз на суткі. Дарослыя чарапахі ядуць раз на двое сутак. Я часта езджу па камандзіроўках, таму рэдкія кармёжкі для мяне выгадныя, — прызнаецца Воля. — Яшчэ я цікавілася, ці можна сяліць у акварыум рыбак. Прадавец пажартаваў: «Можна, але да той пары, пакуль рыбка не ўлазіць у рот чарапасе».


Фота Надзеі БУЖАН.

Нечакана, але земнаводных можна выкарыстоўваць у якасці будзільнікаў. Зранку, у пошуках ежы, Феня і Марцін пачынаюць актыўна кешкацца ў каменьчыках. Спаць пры такім шуме цяжка.

Аднойчы чарапашка захварэла на нешта, падобнае да кан'юктывіту: ледзь расплюшчвала вочы і сослепу білася аб сценкі акварыума. Тады Воля сутыкнулася з сур'ёзнай праблемай: знайсці ўрача для земнаводнага амаль нерэальна. Нават у сталіцы спецыялістаў па чарапахах вельмі мала. Давялося кансультавацца ў арнітолагаў. Карысным аказаўся і рэсурс cherepahi.ru, які вядуць апантаныя аматары чарапах. Урэшце лекарка для чарапашкі знайшлася і пацыентка атрымала кваліфікаваную дапамогу.

— Мяркую, чарапахі хварэюць, калі на іх не звяртаеш увагі. Я была настолькі загружана працай, што падыходзіла да акварыума толькі, каб пакарміць Феню і Марціна ды прыбраць у іх. Калі хварэюць, з імі цяжка, бо рэптыліі маўчаць і не могуць гукамі перадаць свой стан, — мяркуе Воля.

Дарэчы, сярод захворванняў вельмі распаўсюджана чарапашая прастуда, якая можа ўзнікнуць з-за паніжэння тэмпературы ў акварыуме ці раптоўнага скразняку.

Скончыўшы фотасесію ў акварыуме, чарапашкі перабіраюцца на «падлогу», каб зноў папазіраваць фатографу. Скажу адразу — сачыць за гэтымі «павольнымі» і «млявымі» жывёламі трэба вельмі пільна. Не паспееш і вокам міргнуць — яны ўжо ўцяклі. І хто выдумаў міф аб тым, што тарцілы «тармозяць»?

— Многія ў мяне пытаюцца — чаму я выбрала менавіта чарапах, а не коціка ці папугайчыка? Мяне падкупіў той факт, што яны жывуць доўга — да 40-50 гадоў. Спадзяюся, старацьмы сустрэнем разам. Другі момант — непераборлівасць рэптылій. А яшчэ яны выдатна здымаюць стрэс. У кожнага чалавека, напэўна, бываюць такія дні, што хочацца ад стомы паплакаць. Калі такое здараецца ў мяне, я проста саджуся перад акварыумам і хвілін 40 назіраю за Феняй ды Марцінам. Яны ўмеюць зараджаць энергіяй. Цяжка сказаць, пазнаюць яны мяне ці не, але мне хочацца верыць, што так яно і ёсць.

**Кацярына РАДЗЮК**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 200/С-42643, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Журжевская, д. 17, год постройки – 1975, площадь постройки – 351 кв.м, общая площадь – 352,4 кв.м, назначение – двухэтажное кирпичное здание гаража, фундамент – железобетонный, стены – кирпичные, перекрытия – железобетонные, перегородки – кирпичные, крыша – рубероидная, полы – дощатые, бетонные, внутренняя отделка – оштукатурено, водопровод – есть, электроосвещение – открытая проводка, канализация – есть, начальная стоимость лота 524.640.000 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область. Право собственности: Абросимов Александр Юрьевич |
| **Место-нахождение имущества** | г. Витебск. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Сорокину Алексею Викторовичу, г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, каб. 312 (раб. тел. 8029-715-14-66) |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10-1. 23 декабря 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10-1. Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92, т.м. 37533-687-91-20. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, №3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 22 декабря 2015 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**МОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» сообщает о проведении 24.12.2015 г. в 12.00 повторного аукциона по продаже капитального строения с инв. № 700/С-55738 – Гараж, весовая, расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 8А**

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи – 1 216 243 700 бел. рублей. Сумма задатка – 121 624 400 бел. рублей** | |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| *Информация о проведении предыдущих аукционов размещена в газете «Рэспубліка» от 06.05.15 г., 24.06.15 г., 19.08.15 г., газете «Звязда» от 12.11.15 г.* | |

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона:
**(8-0222) 25-03-37, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25, эл. почта bti9@inbox.ru**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | |
| **Продавец** | **ОАО «Медпласт», г. Гомель, ул. Объездная, 12** | |
| **Предмет аукциона** | | |
| **Наименование** | **Общая площадь, м²** | **Инвентарный номер** |
| Здание цеха пластмассовых изделий | 2269 кв.м | 350/С-43619 |
| Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, сени, служебное помещение, ворота, забор | | |
| Трансформаторная подстанция № 181 (в т.ч. трансформатор, инв. № 40041) | 96,8 кв.м | 350/С-78584 |
| Водопроводная сеть | протяженность 86,6 м | 350/С-138467 |
| Канализационная сеть | протяженность 105,8 м | 350/С-138487 |
| **Адрес предмета аукциона: г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 79** | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 1 665 220 800 белорусских рублей (снижена на 50%)** | | |

**Сведения о земельном участке**: Для эксплуатации и обслуживания здания цеха пластмассовых изделий продавцу на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) предоставлен земельный участок пл. 0,2865 га, с установленными ограничениями – охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0386 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0105 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0365 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0365 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0053 га. Для эксплуатации и обслуживания трансформаторной подстанции №181 продавцу предоставлен на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) земельный участок пл. 0,0244 га, с установленными ограничениями – охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0038 га. К трансформаторной подстанции подключены субабоненты

**Сведения по арендаторам:** ЗАО «БеСТ» – участок асфальтобетонного покрытия под установку конструкции антенной мачты высотой Н-26 и контейнера с оборудованием сотовой связи, общей площадью 25 кв.м (срок действия договора по 18.08.2017 г). ИП Клещук В.А. – помещение на 1 этаже здания цеха пластмассовых изделий для размещения участка по производству корпусной мебели, общей площадью 48,16 кв.м (срок действия договора по 15.04.2018)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после проведения аукциона

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2015*

**Порядок проведения аукциона,** оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.01.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-й этаж, актовый зал** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by. www.cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | | |
| Изолированное помещение административного здания инженерного корпуса | Административное помещение | 29,5 кв.м | 100/D-79977 | г. Брест, ул. Московская, д. 204 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 560 857 200 белорусских рублей** | | | | |
| **Лот № 2** | | | | |
| Изолированные помещения административного здания инженерного корпуса | Административные помещения | 247,6 кв.м<br>295,2 кв.м | 100/D-79978<br>100/D-79045 | г. Брест, ул. Московская, 204-1; 204-2 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 6 246 249 922 белорусских рубля** | | | | |

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот № 3** | | | |
| Здание производственно-бытового корпуса | 3 695 кв.м | 710/С-2712 | г. Бобруйск, ул. Минская, д. 170 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,9864 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 5 471 396 740 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 4** | | | |
| Здание магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания | 664,4 кв.м | 710/С-11693 | г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,1101 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 7 171 332 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 5** | | | |
| Здание склада | 104 кв.м | 710/С-13763 | г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0250 га предоставлен на праве аренды сроком по 01.01.2058 г. для содержания и обслуживания склада | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 368 116 800 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 6** | | | |
| Здание гостиницы | 1 155,2 кв.м | 710/U-3619 | Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, около д. Сычково |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,2796 га предоставлен на праве аренды сроком по 25.04.2027 г. для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного здания гостиницы | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 5 556 480 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 7** | | | |
| Помещение, не относящееся к жилищному фонду | 695 кв.м | 340/D-21052 | Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Советская, д. 147, пом. 3 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,2796 га предоставлен на праве аренды сроком по 25.04.2027 г. для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного здания гостиницы | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 7 350 624 000 белорусских рублей** | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона (лота) в белорусских рублях (BYR) перечисляется на расчетный счет 3012252296016 в ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк», код 739. Адрес банка: 220004, г. Минск, просп. Машерова, д. 29, УНП 191438026, получатель платежа – ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.01.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by** |

# Извещение о проведении повторного аукциона 22 декабря 2015 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| **Наименование объекта** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-43055 «Блок закрытых складов»** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-43066 «Склад металла с бетонной площадкой»** | **Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-40762 (здание лесопильного цеха) с прилегающей бетонной площадкой и инженерными коммуникациями и трансформаторной подстанцией** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций»** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций»** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/9 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11К | г. Пинск, ул. Калиновского, 11В | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 |
| **Продавец объекта** | ТОРГОВОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «ПриБут» | | | | |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| **Общая площадь (кв.м)** | 1315 | 4101,1 | 2458 | 3982,2 | 4516,7 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 0,2629 | 0,5833 | 1,2294 | 1,444 | |
| **Начальная цена (бел. рублей)** | 951 480 000 | 420 480 000 | 1 500 234 033 | 2 954 698 596 | 3 349 591 312 |
| **Сумма задатка (бел. рублей)** | 95 148 000 | 42 048 000 | 150 023 403 | 295 469 860 | 334 959 131 |
| **Условия продажи** | Разовый платеж | Разовый платеж | Разовый платеж | Рассрочка платежа до 3-х лет | Рассрочка платежа до 3-х лет |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажный, состоит из 4-х закрытых (изолированных) складских помещений с двумя подсобными (служебными) помещениями площадью 24,4 м². По всему периметру блока имеется рампа площадью 467 м². К блоку примыкает огражденная бетонная площадка 397 м². Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Открытый, состоящий из огражденной ж/б панелями бетонной площадки 2087,5 м² и неогражденной бетонной площадки 1681,5 м², бетонного покрытия 331,8 м², подземного кабеля АСБ 3*50 протяженностью 28,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Здание лесопильного цеха двухэтажное с административным и санитарно-бытовыми помещениями, специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева. Введено в эксплуатацию в 1983 году. | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый, пролеты оборудованы кран-балками г/п 3тн. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый, пролеты оборудованы кран-балками г/п 5тн. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г. |
| **Организатор аукциона** | **Открытое акционерное общество «Пинский комбинат строительной индустрии»** | | | | |

**Аукцион состоится 22 декабря 2015 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. *Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет Торгового унитарного предприятия «ПриБут» р/счет 3012156959005 в ОАО «Белвнешэкономбанк» в г. Пинске, код 153001226, УНП 291190544, срок внесения суммы задатка – по 21 декабря 2015 г. включительно.*

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Более подробную информацию можно получить в торговом унитарном предприятии «ПриБут» по тел. *375-29-674-55-42*.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 21 декабря 2015 года включительно, тел. 80165-37-16-07, тел.факс (80165) 37-16-66.**

**Контактный телефон 375-29-674-55-42.**

■ Вам і не снілася

# ЗАМУЖ... ЗА РЫЦАРА

## НА ПЕРШАЕ СПАТКАННЕ — У ВОБРАЗЕ

**Равене, або Ганне, вельмі пашчасціла. Пакуль яе аднагодкі безвынікова шукаюць рыцараў па ўсім свеце, яна знайшла свайго Айвенга — Аляксея — у інтэрнэце. Жывуць цяпер разам на дзве эпохі, прагматычную нашу і рамантычную — Сярэднявечча. Хлопец так сур'ёзна захапляўся часамі рыцараў, што і сваю любімую заразіў. Цяпер гэта сямейнае хобі, прычым нават для дзвюх іх дачок. Ганна і Аляксей Антонавы родам са Смаленска, але апошнія некалькі гадоў пастаянныя госці рыцарскага фэсту ў Мсціславе. Кажуць, што тут ім вельмі падабаецца атмасфера. Гэта прыгожая пара адразу кідаецца ў вочы. Яны быццам сапраўдныя героі раманаў Вальтэра Скота, якімі зачытвалася ў юнацтве.**
**І, як высветлілася, жыццё маладых сужэнцаў не менш захапляльнае. Дастаткова ўзгадаць іх першае спатканне, каб стала ўсё зразумела.**



### «Маці спачатку падумала, што я трапіла ў секту»

— І ў думках сабе не магла ўявіць, што ён прыйдзе знаёміцца са мной у касцюме крыжака, — усміхаецца Ганна. — Я так разгубілася, што не ведала, як быць. Але развярнуцца і пайсці нешта перашкаджала. Гэта зусім не было падобна на жарт. Я разумела, што ён захацеў мяне пакарыць. І мне гэта спадабалася.

Аляксей, дарэчы, хваляваўся не менш. Прызнаецца, што, калі б Ганна тады ад яго збегла, ён бы зразумеў, што памыліўся і дзяўчына не для яго. Яму вельмі важна было ведаць, як яна адрэагуе. І калі Ганна працягнула яму сваю руку, быў на сёмым небе ад шчасця.

На памяць засталася рамантычная прагулка па старадаўняй Смаленскай замкавай крэпасці. Ішоў асенні дождж, і Энтан («рыцарскае» імя Аляксея) беражліва прыкрываў дзяўчыну сваім чорным плашчом. «Гэта было так рамантычна», — з пяшчотай у вачах глядзіць на свайго абранніка Ганна.

А вось маці дзяўчыны, наадварот, спачатку была ў шоку. Думала, што яе адзіная дачка трапіла ў секту. Мальтыйскі крыж на рыцарскім адзенні зусім не падобны да праваслаўнага.

— У парыве пратэсту мая будучая цешча нават зламала наш клубны сцяг, — усміхаецца Аляксей. — Усё не магла паверыць, што я сапраўды кахаю яе дачку, а не прыдурваюся. Супакоілася толькі, калі мы пажаніліся. Цяпер да нашых пераўвасабленняў ставіцца больш цярпліва.

### Чаравікі для нарачонай

Аляксей — дзіця свайго часу, вырас на раманах Джона Толкіена, таму спачатку захапляўся ролевымі гульнямі. Але аднойчы ў пачатку 2000-х гадоў з'ездзіў у Мінск на фестываль «Белы замак» і «захварэў» на рыцарства. Прычым з усіх ордэнаў выбраў менавіта Мальтыйскі ці, як ён яшчэ называецца, радоскі, або шпітальераў. Яму імпануе тое, што гэта былі веруючыя людзі і вялікія альтруісты. Яны і аб'ядналіся дзеля таго, каб аказваць першую дапамогу паломнікам па дарозе ў Святую Зямлю. Але хутка зразумелі, што людзей трэба яшчэ абараняць і ад сарацынаў.

У звычайным жыцці Аляксей — праграміст, а вось Ганна — доктар. І ёй было зусім не цяжка ўліцца ў шэрагі шпітальераў. Прызнаецца, што ў іх клубе «Крыжаносец» шмат медыкаў.

Як і ўсякае іншае захапленне, гэта таксама патрабуе выдаткаў. Кожны рыцар павінен мець свой гардэроб і амуніцыю. Ганна апранута па ўсіх канонах рыцарства ў шыкоўнае плацце, прычым з натуральнага шоўку ручной работы.

— Ручны шоўк — вельмі дарагі матэрыял, такі можна купіць толькі ў буйных гарадах, — тлумачыць яна. — Мы, напрыклад, заказвалі яго ў Санкт-Пецярбургу. Вытворчасцю такога шоўку займаюцца ўсяго некалькі мануфактур, якія, можна сказаць, працуюць непасрэдна на патрэбы рэканструктараў. Ёсць таксама людзі, якія спецыяльна робяць на заказ даспехі. Дарэчы, Аляксей за сваю кальчугу некалькі год таму аддаў 18 тысяч расійскіх рублёў.

Пашываць адзенне Ганна займаецца самастойна. У інтэрнэце зараз можна знайсці ўсё што хочаш. Яна нават засвоіла спецыяльную тэхналогію шва, які выкарыстоўвалі тагачасныя модніцы. Гардэроб залежыць ад таго, якога чалавека збіраешся паказаць. Калі няма сродкаў, нічога іншага не застаецца, як выдаваць сябе за сялянку і пашыць просты строй з лёну. Калі дама большага дастатку, яе ўборы больш багатыя. У яе павінны быць мінімум тры спадніцы, якія яна надзявала адначасова. А вось чаравікі для нарачонай Аляксей пашыў сам, таксама паводле ўзору з інтэрнэту. «Яна адну пару ўжо знасіла, гэта другая, — удакладняе ён. — Добра яшчэ, што не кожны дзень прыходзіцца хадзіць у сярэднявечных чаравіках».

— У штодзённым жыцці карыстацца такой вопраткай не вельмі зручна, — прызнаецца Ганна. — Сёння жыццё хуткае, патрабуе больш простых строяў, асабліва калі трэба бегчы на працу ці па дзяцей.

**«У парыве пратэсту мая будучая цешча нават зламала наш клубны сцяг. Усе не магла паверыць, што я сапраўды кахаю яе дачку, а не прыдурваюся. Супакоілася толькі, калі мы пажаніліся».**

— Калі ідзеш па горадзе ў такім выглядзе, усе падыходзяць, каб сфатаграфавацца, — кажа Аляксей. — У нас нават у самай малодшай дачкі ёсць сярэднявечны гардэроб.

### «На полі бою я страчваю адчуванне рэальнасці»

Баі «Шчыт і меч» на рыцарскім фэсце ў Мсціславе, напэўна, адны з самых жорсткіх, бо воіны на рысталішчы б'юцца адзін на адзін. І сёлета пераможцам двубою стаў менавіта Аляксей Антонаў. У якасці падарунка ён атрымаў меч. Калі ён сышоў са сцэны, Ганна першая кінулася яго абдымаць. Відаць было, як яна ганарыцца сваім каханым. Аляксей так пяшчотна абдымаў яе, што, напэўна, зайздросцілі ўсе дамы, якія бачылі гэта. Рыцар ёсць рыцар. І гэтым усё сказана.

Каб быць у форме і весь так незалежна трымацца на спаборніцкай пляцоўцы, мужчыну ўвесь час прыходзіцца займацца. Прычым гэта не нейкія там заняткі на трэнажорах, а сапраўдныя баі на мячах з такімі ж, як ён сам, апантанымі.

— *Наколькі захапляецеся, калі пачынаеце змагацца? — цікаўлюся я.*

— Поўнае паглыбленне. Я страчваю адчуванне рэальнасці, цалкам аддаюся справе.

— *А вашы абавязкі па клубе? — пытаюся ў Ганны.*

— Карміць рыцара і быць прыгожай, — усміхаецца яна.

— *А чым вас наогул прываблівае Сярэднявечча? — спрабую зразумець сямейнае хобі.*

— Гэта спосаб адпачыць, далучэнне да гісторыі, — тлумачыць Ганна. — Мы выязджаем, акунаемся ў атмасферу гістарычнага мерапрыемства. Нас усіх аб'ядноўвае любоў да турызму, падарожжаў.

— *А дома вы таксама шпітальеры?*

— Нам хапае фестываляў! — смяецца Аляксей.

— *І часта на іх запрашаюць?*

— У асноўным ездзім у Беларусь, Санкт-Пецярбург, Пскоў, Суздаль... Усюды цікава. Напрыклад, Мсціслаў падабаецца за тое, што вечарам цікавая праграма. На іншых фестывалях больш сціплыя канцэрты. Мне падабаецца, што на рыцарскі фэст у Капотню прыязджаюць аўтэнтычныя групы. Там упершыню ўбачыў старадаўні міні-арган. Мне паказвалі ноты XIII стагоддзя. Не ведаю, адкуль яны іх толькі ўзялі. Музейны экспанат.

— *Дома нешта гатуеце з сярэднявечнай кухні?*

— Старадаўняя кухня была не вельмі багатая, — тлумачыць Ганна. — Елі ў асноўным мяса, гародніну.

— На фестывалі ў Мсціславе нас не кормяць, на іншых здабываем ежу самі, — усміхаецца Аляксей. — У Капотні, напрыклад, мы набівалі мяса і закопвалі за палаткай у зямлю, каб не сапсавалася.

— *Не надакучае такое жыццё?*

— Фестывальныя туры пачынаюцца бліжэй да лета, пасля гэтага яшчэ доўга не хочацца нікуды ехаць. Хоць бываюць фестывалі і зімой. І ўсе жывуць выключна ў палатках. Гэта прынцыпова.

— *А калі хочацца прыняць душ, пасяліцца ў гасцініцы?*

— Не будзе той атмасферы, якая пануе ў той ці іншай эпосе. Мы імкнёмся жыць па тых жа правілах і законах, есці тое, што яны елі, — кажа Ганна.

— Галоўнае ў нашым захапленні — уражанні, — дадае Аляксей. — У гасцініцы ты адчуваеш сябе звычайным турыстам, а ў намёце — рыцарам. Лівень пайшоў — прамок да ніткі, конь іржаў усю ноч на вуха. Гэта тое, што ўспамінаеш потым — конь, лівень, намёт. Гэта табе не стандартны нумар у гасцініцы.

— Калі людзі не могуць абыходзіцца без дасягненняў цывілізацыі, гэта не для іх, — падтрымлівае сужэнца Ганна. — Наша захапленне для аматараў вось такога паходнага ладу жыцця. Каго такое прываблівае, ён застаецца ў гэтым надоўга. Нас не шмат, але мы сябруем гадамі. Тут зусім іншы дух, рамантыка. Цяжкасці нас зусім не палохаюць. Жывём у намётах, снедаем на свежым паветры, прымаем удзел у рыцарскіх забавах і адчуваем сябе неверагодна шчаслівымі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара** ■



Ганна і Аляксей разам з сябрамі.



■ Мама, пачытай!

# Елачка і чарадзей

**Чаму Новы год сустракаюць з ялінкай? І чаму шыпулькі ў яе карацейшыя, чым, напрыклад, у сасны?.. А вось паслухайце.**

Было гэта даўным-даўно. Маладая прыгожая хвоечка, падораная Дзеду Марозу, рыхтавалася сустракаць Новы год. Думала, чым жа ўпрыгожыць сябе, апроч снегу і з лета прыхаваных шышак? Ну хіба папрасіць птушак, што пралятаюць міма, каб селі на галінкі — усё ж аздоба...

Думае вось так гэтае дрэўца, прыбіраецца і раптам чуе — нехта ўздыхае паблізу. Азірнулася — а там елачка (яна ў той час яшчэ ліссце насіла, і якраз напярэдадні скінула). Вось і кажа хвоечцы: «Шчаслівая ты... Увесь час зялёная... І з табой сустракаюць Новы год... Вось каб ён надыходзіў летам, тады і мяне, можа, узялі б на свята?».

Шкада стала хвоечцы сваёй суседкі. Узяла яна і падарыла ёй частку сваіх доўгіх шыпулек.

А елачка змыслая была: кожную доўгую сасновую шыпульку яна... падзяліла на некалькі кароткіх і густа-гусценька прыбрала свае галінкі. Хораша атрымалася! А каб стала яшчэ лепш, елачка папрасіла адну зорачку спусціцца з неба і сесці ў яе на верхавінцы.

Прыйшоў Дзед Мароз і бачыць: стаіць проста цуд якое дрэўца — новае, прыгожае! Чарадзей узяў яго і занёс людзям.

З таго часу яны сталі сустракаць Новы год не толькі з хвоечкай, а яшчэ і з ялінкай.

І ўпрыгожваць яе пачынаюць з вершалінкі, адкуль некалі, даўным-даўно, адляцела ў нябёсы жывая зорачка.

**Ілья ШАХРАЙ**, *г. Мінск* ■

**Да Новага года засталося не так шмат часу, але для асабліва нецярплівых, маю на ўвазе дзяцей, цягнецца ён занадта марудна. Каб аблегчыць чаканне, напоўніце гэты перыяд сюрпрызамі і цікавымі заняткамі. Як? Адвент-каляндар вам дапаможа!**







■ Майстар-клас

# АДВЕНТ-КАЛЯНДАР,

## або Калі чаканне — таксама свята

ІДЭЯ такога календара прыйшла да нас з Германіі. Там адвентам называецца час перад Раством Хрыстовым. Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя немцы малявалі крэйдай на сцяне або дзвярах рысачкі — столькі, колькі дзён засталося да свята, а потым паступова выціралі па адной. У некаторых сем'ях штодзень запальвалі па свечцы або ўпрыгожвалі сцены дома малюнкамі з рэлігійнымі сюжэтамі. Дарэчы, само слова «адвент» з лацінскай значыць «прышэсце». Гэта быў час строгага посту, дні якога адлічвалі з дапамогай святочнага календара. Той складаўся са скрыначак — усяго было 24. Кожны дзень адкрывалі па адной, усярэдзіне захоўвалася цытата з Біблії.

Таксама вядома гісторыя Герхарда Ланга, якому ў дзяцінстве маці штодзень перад Раством прымацоўвала да паштоўкі цукерку. Хлопец вырас і пайшоў працаваць у друкарню, якая неўзабаве выпусціла першы адвент-каляндар у выглядзе 24 малюнкаў. Крыху пазней яго ўскладнілі, зрабілі з маленькімі кардоннымі дзверцамі, за якімі можна было знайсці ласункі або фрагмент з Пісання.

Прывабнасць адвент-календара перш за ўсё ў тым, што дзякуючы яму чаканне свята можа само па сабе ператварыцца ў свята. Як вядома, сюрпрызы любяць і дзеці, і дарослыя, таму гуляць у такую гульню можна з кім заўгодна. Да таго ж малыя дрэнна адчуваюць час і бясконца пытаюцца ў бацькоў, калі ўжо прыйдзе Новы год. А адкрываючы кожны дзень па скрыначцы, яны могуць наглядна ўяўляць, колькі часу засталося да любімага свята. Дарэчы, для малых звычайна робяць каляндар на 12 дзён, бо 24 здаюцца для іх занадта доўгім часам.

ЗРАЗУМЕЛА, каляндар чакання можна купіць. Але зрабіць яго сваімі рукамі асабліва прыемна. Давайце паспрабуем разам! Стварыць яго нам дапаможа мастачка Надзея Алёхіна. Для яе дачкі Карыны мы зробім навагодні каляндар у выглядзе ёлкі, на якую замест цацак павесім мяшэчкі па колькасці дзён.

Каб зрабіць дрэўца, узялі два баваўняныя адрэзы тканіны, між імі — слой сінтэпону. Намалявалі контур ёлкі і прашылі па ім на машынцы. Затым выразалі дрэўца па контуры, адступіўшы ў большы бок ад машыннай строчкі 1,5-2 сантыметры. Лепш выразаць спецыяльнымі ўзорнымі нажніцамі, каб тканіна не махрылася і ніткі не вылазілі. Ёлка гатова!

Цяпер падрыхтуем мяшэчкі. Зробім іх рознакаляровымі, але абмяжуемся чырвона-залатой гамай. Тут таксама ўсё проста. Выразаем з тканіны прамавугольнікі памерамі 10x18 см. Па меншым баку робім закладкі па 1,5 см і сшываем. Не забудзьцеся прымацаваць стужку-завязку. Робім такіх мяшэчкаў па колькасці дзён — у нас будзе 25. Нумаруем з дапамогай акрылавага контуру. Калі ў вас яго няма, можна намаляваць лічбы на паперы, выразаць і прыклеіць. Але перш чым вешаць мяшэчкі на ёлку, упрыгожым яе пацеркамі. Прымацуем іх ніткамі па краях, астатняе будзе свабодна звісаць. Затым раскладваем мяшэчкі па парадку (або хаатычна) і прышываем гузікі, на якіх яны будуць трымацца.

Нам засталася самая прыемная частка — раскласці ў іх цікавыя заданні для Карыны і, вядома, не забыць пра смачныя падарункі. Надзея вырашыла зрабіць для дачкі своеасаблівы штотыднёвік, у якім распісала заданні па падрыхтоўцы да Новага года на кожны дзень: упрыгожыць свой пакой папяровымі сняжынкамі, вывучыць новую навагоднюю песенку, зляпіць снегавіка на прагулцы і сфатаграфавацца з ім, разам з татам змайстраваць кармушку для птушак і кожныя тры дні прыносіць корм... Дарэчы, такія заданні ўспрымаюцца не як абавязалаўка, а вясёлая гульня, напрыканцы якой абавязкова чакае салодкая ўзнагарода.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**

***Дзякуем за правядзенне майстар-класа Надзеі Алёхінай. За прыгожую і ўтульную абстаноўку — кавярні-майстэрні «ДА»***



Фота Тацяны РУСАКОВІЧ.

### Лавіце ідэі

**➤ Своеасаблівымі кішэнькамі адвент-календара могуць стаць: рознакаляровыя шкарпэткі, рукавічкі, слоічкі, скруткі, канверты, папяровыя пакеты, пірамідкі, вядзерцы, прышчэпкі, запалкавыя пушкі, кубкі, адным словам, што заўгодна. Павесьце іх на ёлку (снегавіка, вешалку, стужку, сухія галінкі).**

**➤ Акрамя салодкіх сюрпрызаў, у адвент-каляндар можна пакласці маленькія падарункі: цацкі, налепкі, магніты, матэрыялы для творчасці, маленькія кніжкі, білеты на навагоднія спектаклі і г.д. Калі падарункі не змяшчаюцца ў скарбоначках, можна пакінуць у іх толькі карту, якая падкажа, дзе схаваны падарунак. Цікава набыць набор цацак (заапарк, крама, гараж), і кожны дзень у гульню будуць уступаць новыя героі. Або раскласці па кішэньках пазлы, з якіх у апошні дзень вы разам з малым складзяце навагодні малюнак.**

**➤ Можна выкарыстаць каляндар чакання як дапаможнік для навучання. Пакладзіце ў акенцы календара загадкі, песенкі, вершы, цытаты з навагодніх мульцікаў; з дашкалятамі можна такім чынам вывучыць колеры, фігуры, лічбы, літары і інш.**

■ Сямейная кухня

## Імбірнае печыва

**У нас з сяброўкамі ёсць цудоўная традыцыя. Напярэдадні Новага года і Каляд мы збіраемся ў Тані дома і за душэўнымі размовамі распісваем імбірнае печыва. Выпякаем жа яго нязменна па рэцэпце з часопіса, які Маруся калісьці прывезла з Чэхіі. Вось ён, правераны часам, дзялюся:**




650 г мукі
250 г цукровай пудры
100 г мёду
50 г сметанковага масла
4 яйкі
2 ч. л. соды
2 ч. л. спецый (імбір, карыца, гваздзіка і г.д.)
1-2 ч. л. лыжкі какавы

Мы звычайна бяром усіх інгрэдыентаў удвая менш.

Выпякаем імбірнае печыва пры тэмпературы 150 °C 8-10 хвілін.

## Слоічак успамінаў



А Наталля Ізумрудава падзялілася выдатнай традыцыяй, якую варта ўзяць на заметку: «З пачатку новага года я заводжу сабе слоічак, куды складваю цыдулкі з прыемнымі падзеямі, якія здараюцца са мной. 31 снежня вытрасаю іх усе, чытаю і ўсміхаюся. Столькі ўсяго добрага адбылося, пра што я без тых запісак не ўзгадала б! І тады адыходзячы год заўсёды праводжу з удзячнасцю».

## Прычоска з водарам Каляд

А Марыя Вайтовіч нядаўна атрымала незвычайную параду:

— Навошта ты заколваеш валасы палачкай ад сушы?

— Я не прывыкла хадзіць з прычоскамі, але калі надакучае, заколваю тым, што трапіцца пад руку.

— Дык устаў у свае валасы палачку карыцы, яны будуць пахнуць Калядамі.

**Шаноўныя чытачы, а чым пахне ваша падрыхтоўка да зімніх свят? Дзяліцеся сваімі назіраннямі, парадамі, жыццёвым досведам, тым, што хвалюе. І, вядома, беражыце сябе!**

■ Маміны дзённікі

**На градцы спеюць зеленавата-плямістыя кабачкі. Антоша абрадаваўся:**

**— Глядзіце, ваенныя кабачкі!**

☺ ☺ ☺

У лесе ён усклікае:

— А мухаморы ўсе ў вяснушках!

☺ ☺ ☺

**Ян глядзіць на дрэвы:**

**— Ад моцнай залевы дрэвы да неба вырастуць?**

☺ ☺ ☺

У вёсцы бабуля падаіла карову. Ян падстаўляе кубак:

— Зараз буду піць пушыстае малачко.

☺ ☺ ☺

**Паглядзеў ранкам Ян у акно і ўсклікнуў:**

**— Ой, зноў зіма напа́дала!**

☺ ☺ ☺

— Твае чаравікі ўжо хочуць есці! — паказвае бабуля Яну адклееную падэшву.

— А што яны любяць есці — гразь?

☺ ☺ ☺

**Ян паваляўся ў ложку, а потым рашуча ўскочыў:**

**— Усё, паспаў! Мне цяпер сніўся мядзведжы сон!**

**— Як гэта?**

**— Пра мёд!**

☺ ☺ ☺

— Янечка, што ты будзеш зараз рабіць?

— Я буду... я буду... нічога не рабіць!

**Занатавала Ала ЖУР.**

*«КАЛІ ДЗІЦЯ ПАМЫЛЯЕЦЦА, ЯМУ БОЛЬШ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА, ЧЫМ ВЫМОВА АБО ПАКАРАННЕ». М. КОЛІНЗ*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.**

# КЛІМАВІЦКАЯ «КУНСТКАМЕРА»

## Карэспандэнт «Звязды» наведала музей, які лічыцца адным з самых вялікіх у Беларусі па колькасці сабраных тут анатамічных экспанатаў

**Клімавіцкі аграрны каледж адзіны ў нашай краіне з 8 падобных яму ўстаноў мае такі музей. Адзін час хадзілі чуткі, што тут захоўваюцца так званыя ахвяры наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Бо калекцыя збіралася якраз пасля сумнай даты. Але супрацоўнікі ўстановы не бяруць на сябе адказнасці пацвярджаць гэта. Бо двухгаловыя цяляты — гэта яшчэ не факт непасрэднага ўздзеяння радыяцыі. Для таго, каб гэта даказаць, неабходны больш дасканалыя даследаванні. А тут пераследавалі зусім іншыя мэты. Стварылі сваім навучэнцам умовы для лепшага вывучэння іх профільных прадметаў.**

### Амаль што парк юрскага перыяду

Тэарэтычна ў каледжа 2 музеі. Пачынаем агляд з найбольш бяскрыўдных экспанатаў — шкілетаў і чучалаў жывёл і птушак. Калекцыя насамрэч уражвае. Навучэнцамі аддзялення ветэрынарнай медыцыны і іх выкладчыкамі за крышачку болей чым два дзесяцігоддзі сабрана звыш паўтары тысячы экспанатаў.

— У нас няма ніводнага муляжа, усё выключна натуральнае, — уводзіць у курс справы **Любоў ПУСЯНКОВА, загадчыца лабараторыі анатоміі і фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл.** — Матэрыял узяты ад забойных жывёл. Па нашай просьбе косці не ламалі, аддавалі шкілеты цалкам. Мы самі правodзілі апрацоўку, выварванне, абястлушчванне. Нават навучыліся рыхтаваць шкілеты на натуральных звязках. Вельмі працаёмкі і марудны працэс. Мышцавая сістэма рыхтуецца як мінімум паўтара-два гады. Анатомія — гэта такая дысцыпліна, якую на пальцах не пакажаш, Сказаць, дзе сэрца размешчана, — гэта адно, а ўбачыць — іншае.

Спецыялісты хутка адрозніваюць, якую жывёлу прадстаўляе той ці іншы шкілет. А вось такому дылетанту, як я, яны спачатку нагадвалі дыназаўраў. Тое, што я прыняла за невялічкага яшчара, калісьці было свіннёй вагой 500 кілаграмаў.



Любоў ПУСЯНКОВА стаяла ля вытокаў стварэння музея.



Анамальныя экспанаты.

Абаронцы жывёл могуць заставацца спакойнымі. Каледж не мае дачынення ні да адной смерці братоў нашых меншых. Усе яны памiралі сваёй смерцю. Тут ім, наадварот, далі другое жыццё.

— Страусяня нам перадалі са страусаранча. Там нашы выпускнікі працуюць, — тлумачыць выкладчыца. — А вось гэтую вавёрку, якая скокнула няўдала, ударылася аб машыну і загінула, прывезлі навучэнцы. Мы яе прэпарыравалі і зрабілі чучала. Зайчыха ў нашым гаі зімой трапіла ў пастку і загінула.

### Двухгаловыя цяляты, парася-слон і «анарэксічная» курыца

«Музей паталагічнай анатоміі і фізіялогіі, створаны ў 1987 годзе, — адчыняе дзверы ў пакой з анамальнымі экспанатамі мой наступны экскурсавод **Людміла ШАРАЕВА, выкладчык па вучэбнай дысцыпліне «паталагічная фізіялогія і анатомія жывёл».** — Зараз тут захоўваецца каля 500 экспанатаў».

Першае, што кідаецца ў вочы, — гэта шкляныя шафы і палічкі са слоікамі розных памераў. Тут сабрана ўся паталогія ўнутраных органаў хворых жывёл: ад запалення да дыстрафіі з атрафіяй. Вось, напрыклад, прыкметы лейкозу, калі ўнутраныя органы павялічаны ў 10-40 разоў. Уяўляеце сэрца ў 40 разоў большае за звычайнае? А вось лейкозная нырка гіганцкіх памераў. Такія жывёлы доўга не жывуць. Нават іх органы ўяўляюць небяспеку. З імі трэба працаваць вельмі асцярожна.

А на з'едзеную эхінакокамі печань наогул страшна глядзець — уся ў дзірках. Дарэчы, эхінакокі бываюць памерамі ад гарошыны да галавы новананароджанага дзіцяці. А гэта ўжо лічынкі падскурнага авадня. «Яны высвіваюць уздоўж хрыбетніка, псуюць скуру жывёл, ад гэтага гаспадарка стрaчвае грошы, — удакладняе выкладчыца і дэманструе яшчэ адзін экспанат, ад якога пачынае нудзіць: — Гэта фасцыёлы, яны выклікаюць пашкоджанні печані. Калі па іх праводзіш адваротным бокам нажа, яны варушацца. Іх яшчэ ў народзе называюць мятлушкамі. Фасцыёлы паразітуюць усюды — у мышцах, кішэчніку».

І тут на мае вочы трапляе цяля з дзвюма галовамі і трыма канечнасцямі. У якой гаспадарцы яно нарадзілася, тут не могуць сказаць. Даўно гэта было. «Калі мы рыхтуем прэпараты, мэты захаваць гісторыю з'яўлення канкрэтнай жывёлы няма, — кажа Людміла Ігараўна. — Яны нам патрэбны не дзеля таго, каб кагосьці палохаць жахлівымі расказамі, а паказаць, што такія выпадкі таксама сустракаюцца ў нашым жыцці. З дапамогай гэтага матэрыялу мы на лабараторна-практычных занятках адпрацоўваем навыкі, ставім дыягназ. Што датычыцца цяляці, то яно нарадзілася неданошаным і памерла».

Наогул, слоікаў, дзе законсерваваны органы з рознай паталогіяй, шмат. Гэта зародкі ў розных стадыях развіцця, выкідышы, мёртванароджаныя. Тут можна ўбачыць парася са слановымі канечнасцямі, яшчэ адно з мазгавой грыжай, ад чаго яно ўсё ссохлася. Здараюцца анамаліі і сярод птушак. У чарговым слоіку падобная да птушаняці пэрадактыля знясіленая курыца. Уся свеціцца наскрозь — скура ды косці.

Калекцыя, між тым, папаўняецца. Пры кожнай лабараторыі працуе гурток тэхнічнай творчасці. Навучэнцы спрабуюць рабіць экспанаты. Самі прывозяць цікавы матэрыял з практыкі.

Некалькі гадоў таму ў Клімавічах быў зафіксаваны небывалы выпадак. У рацэ Лабжанка мясцовыя рыбакі вылавілі 2 піранні. Экспанаты, вядомая справа, трапілі ў каледж. «Рыбамі мы не займаемся, — удакладняе Людміла Ігараўна. — Але цікава паглядзець на іх. Мы мяркуем, што яны тут не жывуць, нехта іх выпусціў. На ўсю вобласць адзіны такі экспанат».



Пасля трагічнага выпадку вавёрка стала экспанатам.

Супрацоўнікі каледжа ганарацца сваім музеем. І ёсць за што. У адрозненне ад іншых адукацыйных устаноў, дзе на набыццё экспанатаў трацяць немалыя грошы, тут іх ствараюць сваімі рукамі. І лічацца прафесіяналамі ў гэтай сферы. «Ілюструем вучэбны працэс, рыхтуем дапаможнікі, — кажа Людміла Шараева. — Робім гэта на грамадскіх пачатках і выключна для сябе».

Музей каледжа вядомы далёка па-за межамі райцэнтра. Ён нават уключаны ў мясцовы турыстычны маршрут. Неяк прыязджалі турысты з Бранска, здзівіліся, што ўсё на такім узроўні. Сустракаліся і спецыялісты, якія гадамі працуюць у гаспадарках, а паталогіі ўбачылі ўпершыню. Тутэйшыя выкладчыкі не разумеюць, як можна пры гэтай спецыяльнасці не ведаць такія важныя рэчы. Без іх амаль немагчыма правесці дыферэнцыяльную дыягностыку. Будучым ветэрынарам і заатэхнікам абавязкова трэба наведацца ў каледж. Бо ніякія тэарэтычныя веды не заменяць нагляднага матэрыялу.

Крываважэрныя піранні, на шчасце, нікога не паранілі.



### Цікава даведацца

**Музей Vrolik** (Амстэрдам, Нідэрланды) заснаваны бацькам і сынам Вролікамі. У перакладзе з англа-галандскай слова «вролік» азначае «задзірысты». Герардас і Вільям Вролікі былі прафесарамі медыцыны і займаліся вывучэннем мутацый у чалавеку. Імі сабрана велізарная калекцыя, якая з часам ператварылася ў музей. У якасці экспанатаў прадстаўлены сіямскія двайняты, дзэці-цыклопы, двухгаловыя пачвары.

**Выстава The Human Body Exhibition**, або Выстава цела чалавека, упершыню была экспанавана ў Фларыдзе ў 2005 годзе і з тых часоў прайшла ў многіх гарадах свету. У якасці экспанатаў выкарыстаны забальзамаваныя чалавечыя целы, прэпараваныя такім чынам, каб паказаць, з аднаго боку, усю складанасць будовы чалавечага арганізма, а з другога — яго прыгажосць і гармонію. Наколькі гэта прыгожа выглядае, мяркуйце самі. Неабходна адзначыць, што людзі, чые целы выстаўлены ў якасці экспанатаў, яшчэ пры жыцці далі пісьмовую згоду на такое выкарыстанне іх пасля смерці.

**Кунсткамера ў Санкт-Пецярбургу** заснавана ў 1714 годзе па загадзе Пятра I. Там сабрана больш за мільён экспанатаў. Калі раней яны выкарыстоўваліся для навуковых мэт, то цяпер гэта выключна музей чалавечых мутацый і анамалій, дзе наведвальнікі могуць на свае вочы ўбачыць неверагодныя метамарфозы, якія прырода робіць з чалавечым целам. Варта сказаць, што, акрамя так званай «выставы вырадкаў», дадзены музей вядомы шматлікімі экспанатамі, якія распавядаюць гісторычнае мінулае многіх народаў свету.

**Паразіталагічны музей у Мегуро (Токіа, Японія)** быў заснаваны шэсцьдзесят гадоў таму доктарам Светура Камегаі. Ён пачаў збіраць экспанаты, якія наглядна дэманструюць, што могуць зрабіць паразіты з чалавекам у выпадку адмаўлення гігіенічных норм і правілаў. Музей быў заснаваны неўзабаве пасля вайны, калі эпідэміі і хваробы наносілі японскаму грамадству шкоду, супастаўную з наступствамі ваенных дзеянняў.

**Музей «Plastinarium» (Губен, Германія)** адкрыўся ў невялікім гарадку на мяжы з Польшчай. Яго арганізаваў Гюнтэр фон Хагенс па мянушцы «Доктар Смерць». У якасці экспанатаў ён выкарыстоўваў набытыя трупы людзей, у тым ліку і пакараных зняволеных. Перад тым, як стаць экспанатамі, целы апрацоўваліся адмысловым спосабам, у выніку чаго з іх выдаляўся тлушч і вада. Іх месца замяшчалася субстанцыяй, якая па структуры нагадвае пластык. У музеі можна сустрэць розныя скульптурныя кампазіцыі з мёртвых цел, напрыклад, дзе яны гуляюць у карты альбо скачуць на кані. Наведванне музея нарадзе супярэчлівыя пачуцці, некаторыя нават страчваюць прытомнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**


РЕЗУЛЬТАТЫ РОЗЫГРЫША РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!»

**Организатором Игры** является Совместное общество с ограниченной ответственностью «Волшебный остров» (далее по тексту – Организатор), зарегистрированное Минским горисполкомом от 01.10.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690455676. **Юридический адрес**: Республика Беларусь, 222827, Минская обл., Пуховический р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, д. 49, комн. 2, тел.: (37517)503-15-86, 503-15-87, 503-15-88, 503-15-90, тел./факс 503-15-70. УНП 690455676.

**Наименование Игры:** «В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!».

**Игра проводится** в период (далее по тексту – Срок проведения Игры) с 01 октября 2015 г. по 23 декабря 2015 г. (включая период розыгрыша и выдачи призов).

**Игра проводилась в магазинах** «ГИППО» на территории Республики Беларусь: в г. Минске (пр-т Рокоссовского, 2; ул. Горецкого, 2; ул. Городецкая, 30; Игуменский тракт, 30; ул. Сухаревская, 31; ул. Жуковского, 3; ул. Червякова, 57; Минский р-н, д. Боровая; ТЦ «МОМО» Партизанский проспект, 150), в г. Могилеве (ул. Мовчанского, 6); в г. Гомеле (ул. Косарева, 18), в Гродно (ТЦ «OldCity», ул. Дубко, 17).

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры №2626 от 11.09.2015 выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников** Рекламной Игры: 19 человек.

Призовой фонд: разыграны призы третьего уровня (согласно Правилам проведения рекламной игры «В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!»).

Розыгрыши призов второго и первого уровня не состоялись по причине недостаточного количества участников рекламной игры.

| ФИО ПОБЕДИТЕЛЯ | ПРИЗ |
|---|---|
| Павлова Е.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Козловская А.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Петрович Т.Х. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Линник Д.М. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Болотникова А.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Шкурат А.Л. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Королько О.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Стасякова Е.Л. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Бардюгова Е.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Хмелевская В.А. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Говор А.М. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Шейко С.А. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Хилькевич И.А. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Юшкевич С.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Новик С.С. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Ковалёва Ю.В. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Зыль И.К. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Белый В.Н. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |
| Мозго С.М. | арт.KR-7748 Круг для купания малышей Mommy Love |

Дополнительную информацию об Игре можно получить на сайте официального поставщика ТМ «Mommy Love» СООО Волшебный остров **www.mirigr.by**, а также по телефону (017) 503 15 86, (017) 503 15 87 (понедельник – пятница, с 08.00 – 16.20).



**Ликвидационная комиссия объявляет о продаже следующего имущества Торгового унитарного предприятия «Торговая компания «Забудова»** (УНП 690032551):

**1) Блоки в ассортименте.**
Начальная цена – 1 935 367 800 бел. руб. с учетом НДС 20%.
Торги проводятся впервые.

**2) Черепица в ассортименте с поддонами.**
Начальная цена – 1 829 818 800 бел. руб. с учетом НДС 20%.
Торги проводятся впервые.

**Торги в виде аукциона состоятся 11 января 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122 (по месту нахождения организатора торгов).**

Шаг аукциона – 5 процентов.

**Продавец** – Торговое унитарное предприятие «Торговая компания «Забудова» (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88).

**Организатор торгов** – Ликвидационная комиссия Торгового унитарного предприятия «Торговая компания «Забудова».

*Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 1 процента от начальной цены предмета торгов на р/с №3012164221028 в ОАО «Банк БелВЭБ» п. Чисть, код банка 226, УНП 690032551, получатель – Торговое унитарное предприятие «Торговая компания «Забудова», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней с даты отгрузки.

## Рашэнне Канстытуцыйнага

# АБ ПРАВАВЫМ РЭГУЛЯВАННІ ЎЗБУДЖЭННЯ ПРЫВАТНАГА

*27 лістапада 2015 г.*
*г. Мінск*

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Карповіч Н.А., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

разгледзеў у адкрытым судовым пасяджэнні справу «Аб прававым рэгуляванні ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання».

У судовым пасяджэнні прынялі ўдзел:

паўнамоцны прадстаўнік Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе — Мароз Л.Ф., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве;

паўнамоцны прадстаўнік Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе — Міхалькова Л.С., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве;

прадстаўнікі:

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Аніскевіч Р.Г., намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь — Гайдучонак В.А., намеснік Старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Тушынскі І.Г., намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Сяўрук І.Р., начальнік упраўлення Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь па наглядзе за выкананнем заканадаўства Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь;

Рэспубліканскай калегіі адвакатаў — Матусевіч Т.У., намеснік старшыні Рэспубліканскай калегіі адвакатаў.

Вядзенне па справе ўзбуджана Канстытуцыйным Судом 28 кастрычніка 2015 г. у адпаведнасці з часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, часткамі першай і трэцяй артыкула 158 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве».

Заслухаўшы суддзю-дакладчыка Варановіча Т.В., выступленні паўнамоцных прадстаўнікоў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікоў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскай калегіі адвакатаў, прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі, Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КК), Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КПК) і іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, даследаваўшы матэрыялы справы, Канстытуцыйны Суд устанавіў:

1. У адпаведнасці з Канстытуцыяй чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы; дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы (частка першая артыкула 2, частка трэцяя артыкула 21, частка другая артыкула 59).

Згодна з артыкулам 60 Канстытуцыі кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны; з мэтай абароны правоў, свабод, гонару і годнасці грамадзяне ў адпаведнасці з законам маюць права спагнаць у судовым парадку як маёмасную шкоду, так і матэрыяльнае кампенсаванне маральнай шкоды.

У частцы 1 артыкула 33 КК указаны дзеянні, якія змяшчаюць прыметы злачынстваў, што цягнуць крымінальную адказнасць толькі пры наяўнасці выказанага ва ўстаноўленым крымінальна-працэсуальным законам парадку патрабавання асобы, якая пацярпела ад злачынства, або яе законнага прадстаўніка або прадстаўніка юрыдычнай асобы прыцягнуць вінаватага да крымінальнай адказнасці.

Дадзенай норме КК адпавядае частка 2 артыкула 26 КПК, якая вызначае, што справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 153, 177, часткай першай артыкула 178, часткай першай артыкула 179, часткай першай артыкула 188, артыкулам 189, часткай першай артыкула 202, часткай першай артыкула 203, часткай першай артыкула 216, артыкулам 217, часткай першай артыкула 316 і часткай першай артыкула 317 КК, з'яўляюцца справамі прыватнага абвінавачвання, узбуджаюцца асобай, якая пацярпела ад злачынства, яе законным прадстаўніком або прадстаўніком юрыдычнай асобы.

У адпаведнасці з часткай 5 артыкула 26 КПК пракурор мае права ўзбудзіць крымінальную справу аб злачынствах, указаных у частцы 2 дадзенага артыкула, і пры адсутнасці заявы асобы, якая пацярпела ад злачынства, калі яны закранаюць істотныя інтарэсы дзяржавы і грамадства або здзейснены ў адносінах да асобы, якая знаходзіцца ў службовай або іншай залежнасці ад абвінавачванага або па іншых прычынах не здольная самастойна абараняць свае правы і законныя інтарэсы.

Згодна з часткай 1 артыкула 28 КПК пацярпелы, а ў выпадку яго нядольнасці па ўзросце або стане здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яго смерці любы з яго паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і, а таксама законны прадстаўнік маюць права ў парадку, прадугледжаным дадзеным Кодэксам, удзельнічаць у крымінальным праследаванні абвінавачванага, а па справах прыватнага абвінавачвання — права выстаўляць і падтрымліваць абвінавачванне супраць асобы, якая ўчыніла злачынства.

Часткай 1 артыкула 174 КПК устаноўлена, што па паступіўшай заяве або паведамленні аб злачынстве або пры непасрэдным выяўленні прымет злачынства орган дазнання, начальнік следчага падраздзялення, следчы або пракурор прымаюць адно з наступных рашэнняў: аб узбуджэнні крымінальнай справы; аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы; аб перадачы заявы, паведамлення па падследнасці; аб спыненні праверкі і растлумачэнні заяўніку права ўзбудзіць у судзе ў адпаведнасці з артыкулам 426 дадзенага Кодэкса крымінальную справу прыватнага абвінавачвання.

Згодна з артыкулам 425 КПК парадак вядзення па крымінальных справах прыватнага абвінавачвання аб злачынствах, пералічаных у частках 2 і 3 артыкула 26 дадзенага Кодэкса, вызначаецца агульнымі правіламі КПК, за выключэннямі, устаноўленымі главой 44 КПК («Вядзенне па крымінальных справах прыватнага абвінавачвання»).

Так, крымінальная справа прыватнага абвінавачвання ўзбуджаецца асобай, якая пацярпела ад злачынства, або яго прадстаўніком, а таксама прадстаўніком юрыдычнай асобы шляхам падачы ў раённы (гарадскі) суд заявы аб учыненні ў адносінах да яе злачынства, прадугледжанага часткамі 2 і 3 артыкула 26 КПК; заява павінна змяшчаць у тым ліку звесткі аб асобе, якая яго ўчыніла (часткі 1 і 2 артыкула 426 КПК). Суд, прызнаўшы, што заява не адпавядае патрабаванням часткі 2 артыкула 426 КПК, вяртае яе заяўніку для прывядзення ў адпаведнасць з устаноўленымі главой 44 КПК патрабаваннямі і ўстанаўлівае для гэтага тэрмін да дзесяці сутак; паўторны зварот з заявай па тых жа падставах пасля пропуску ўказанага тэрміну не дапускаецца (частка 1 артыкула 427 КПК).

У частцы другой пункта 7 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2006 г. № 10 «О практике применения законодательства, обеспечивающего право граждан на судебную защиту, и мерах по повышению ее эффективности в общих судах» растлумачана, што заява аб узбуджэнні крымінальнай справы прыватнага абвінавачвання можа быць вернута толькі ў тым выпадку, калі яна не адпавядае патрабаванням часткі 2 артыкула 426 КПК і існуючыя недахопы перашкаджаюць яе прыняццю.

Згодна з растлумачэннямі, якія змяшчаюцца ў частках першай і другой пункта 3 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 31 сакавіка 2010 г. № 1 «О практике применения судами норм Уголовно-процессуального кодекса, регулирующих производство по делам частного обвинения», права ўзбуджэння крымінальнай справы аб злачынстве, указаным у частцы 2 або частцы 3 артыкула 26 КПК, і падтрымання па ім абвінавачвання ў судовым пасяджэнні ў якасці прыватнага абвінаваўцы належыць асобе, якая пацярпела ад злачынства; у выпадку яе нядольнасці па ўзросце або стане здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе ўказаныя правы можа ажыццяўляць любы паўналетні блізкі сваяк гэтай асобы або член яе сям'і, а таксама яе законны прадстаўнік (частка першая артыкула 28 КПК); у іншых выпадках выстаўляць і падтрымліваць абвінавачванне могуць асобы, упаўнаважаныя на гэта ва ўстаноўленым законам парадку пацярпеўшым.

У адпаведнасці з пунктам 5 дадзенай пастановы Пленума Вярхоўнага Суда заява аб учыненым злачынстве, што падаецца ў суд, якім узбуджаецца крымінальная справа прыватнага абвінавачвання, з'яўляецца працэсуальным дакументам, які фармулюе абвінавачванне і ўстанаўлівае межы судовага разбору; таму судам неабходна правяраць, ці змяшчаюцца ў заяве ўказанні на тое, калі, кім і дзе здзейснена праціпраўнае дзеянне, у чым канкрэтна яно праявілася, ці адпавядае апісанне злачыннага дзеяння дыспазіцыі крымінальнага закона, ці зроблена спасылка на крымінальны закон (пункт, частку, артыкул), які прадугледжвае адказнасць за дадзенае злачынства; адсутнасць у заяве ўказаных звестак, а таксама іх няпоўнае або неканкрэтнае выкладанне ўшчамляе права абвінавачванага ведаць, у чым ён абвінавачваецца (пункт 1 часткі 2 артыкула 43 КПК), і з'яўляецца падставай для вяртання заявы ў адпаведнасці з часткай 1 артыкула 427 КПК.

З прыведзенага аналізу заканадаўства, якое рэгулюе пытанні ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання, вынікае, што крымінальныя справы дадзенай катэгорыі ўзбуджаюцца асобай, якая пацярпела ад злачынства, шляхам падачы ў раённы (гарадскі) суд заявы аб учыненні ў адносінах да яе злачынства, а таксама могуць быць узбуджаны пракурорам пры адсутнасці заявы асобы, якая пацярпела ад злачынства, калі ўказаныя ў частцы 2 артыкула 26 КПК злачынствы закранаюць істотныя інтарэсы дзяржавы і грамадства або здзейснены ў адносінах да асобы, якая знаходзіцца ў службовай або іншай залежнасці ад абвінавачванага або па іншых прычынах не здольная самастойна абараняць свае правы і законныя інтарэсы.

У крымінальна-працэсуальным законе адсутнічаюць нормы, што абавязваюць орган дазнання, начальніка следчага падраздзялення, следчага або пракурора ўзбуджаць крымінальныя справы прыватнага абвінавачвання пры адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, указанае ў частцы 2 артыкула 26 КПК, а таксама нормы, што прадугледжваюць магчымасць узбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання ў выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, што сведчыць аб наяўнасці прававога прабелу ў заканадаўстве. Дадзеная акалічнасць не дазваляе ў поўнай меры забяспечыць гарантаваную Канстытуцыяй абарону правоў і свабод чалавека і грамадзяніна ад злачынных замахаў.

2. У адпаведнасці з артыкулам 39 Закона «О конституционном судопроизводстве» у Вярхоўны Суд, Генеральную пракуратуру, Следчы камітэт, Міністэрства юстыцыі, Рэспубліканскую калегію адвакатаў і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Канстытуцыйным Судом былі накіраваны запыты, у пісьмовых адказах на якія ўказаныя дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі выклалі сваё меркаванне па справе.

Вярхоўны Суд лічыць, што ў выпадках смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, або адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, справы прыватнага абвінавачвання мае права ўзбудзіць пракурор на падставе часткі 5 артыкула 26 КПК, паколькі дадзеныя акалічнасці ўказваюць на наяўнасць прычын, што не дазваляюць асобе, якая пацярпела ад злачынства, самастойна абараняць свае правы; у сувязі з гэтым у КПК не маецца прабелу прававога рэгулявання па дадзеных пытаннях.

Па меркаванні Генеральнай пракуратуры, у прававым рэгуляванні ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання ў выпадку адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, маецца прабел, для ўстаранення якога неабходна ўнясенне ў КПК змянення, што прадугледжвае абавязак суда ва ўказаным выпадку накіроўваць заяву грамадзяніна, які пацярпеў ад злачынства, органу дазнання для ўстанаўлення асобы, якая ўчыніла злачынства. У выпадку смерці пацярпелага па справах прыватнага абвінавачвання выстаўляць і падтрымліваць абвінавачванне супраць асобы, якая ўчыніла злачынства, у адпаведнасці з часткай 1 артыкула 28 КПК мае права любы з яго паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і або законны прадстаўнік; дадзеныя абставіны можна таксама аднесці да ўказаных у частцы 5 артыкула 26 КПК падстаў для ўзбуджэння справы прыватнага абвінавачвання пракурорам.

Следчы камітэт лічыць мэтазгодным унясенне змяненняў у частку 5 артыкула 26 КПК у частцы ўдакладнення кампетэнцыі пракурора шляхам надзялення яго правам узбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання ў выпадку ўчынення злачынства асобай, звесткі аб якой не вядомы. Адносна сітуацыі, звязанай са смерцю асобы, якая пацярпела ад злачынства, пытанне забеспячэння належнай абароны ў крымінальным працэсе правоў такой асобы, а таксама іншых грамадзян (блізкіх сваякоў, законных прадстаўнікоў) крымінальна-працэсуальным законам не ўрэгулявана.

Міністэрства юстыцыі адзначае, што адсутнасць у заяве аб узбуджэнні крымінальнай справы ў парадку прыватнага абвінавачвання звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, у пэўнай ступені абмяжоўвае права грамадзяніна, які пацярпеў ад злачынства, на судовую абарону парушаных правоў. Па сэнсе нормы часткі 1 артыкула 28 КПК у выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, любы з яе паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і, а таксама законны прадстаўнік надзяляюцца правам як падачы заявы аб узбуджэнні крымінальнай справы ў парадку прыватнага абвінавачвання, так і падтрымання ў судзе абвінавачвання супраць асобы, якая ўчыніла злачынства.

Рэспубліканская калегія адвакатаў указвае на наяўнасць прабелу прававога рэгулявання ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачвання як у выпадку адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла ўказанае ў частцы 2 артыкула 26 КПК злачынства, так і ў выпадку смерці грамадзяніна, які пацярпеў ад злачынства. У сувязі з гэтым крымінальна-працэсуальным законам не забяспечваецца абарона канстытуцыйных правоў грамадзяніна, уключаючы права кожнага на судовую абарону, што з'яўляецца недапушчальным.

У адказе юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адзначаецца, што адсутнасць звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, можа быць аднесена да выпадкаў, калі асоба, якая пацярпела ад злачынства, не здольна самастойна абараняць свае правы і законныя інтарэсы, у сувязі з чым у дадзеным выпадку крымінальную справу ў адпаведнасці з часткай 5 артыкула 26 КПК мае права ўзбудзіць пракурор. Пытанне аб дапушчальнасці ўзбуджэння крымінальнай справы прыватнага абвінавачвання без волевыяўлення памерлай асобы, якая пацярпела ад злачынства, з'яўляецца дыскусійным па прычыне цеснай сувязі злачынства з асобай пацярпеўшага.

3. Канстытуцыяй устаноўлена, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сацыяльнай прававой дзяржавай, забяспечвае законнасць і правапарадак (часткі першая і трэцяя артыкула 1); грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, якія ўскладзены на яго Канстытуцыяй (частка другая артыкула 2); абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб (частка першая артыкула 23); дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы (частка першая артыкула 25); кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць (артыкул 28).

Канстытуцыйны Суд лічыць, што дзяржава, грунтуючыся на дадзеных канстытуцыйных палажэннях, у адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 97, пунктам 1 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі мае права на заканадаўчым узроўні ўстанаўліваць злачыннасць калектыўна небяспечных дзеянняў, іх каральнасць,

## Суда Рэспублікі Беларусь

# КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ АБВІНАВАЧАННЯ

а таксама дыферэнцыраваць парадак прыцягнення вінаватых асоб да крымінальнай адказнасці.

Так, згодна з часткай 1 артыкула 26 КПК, у залежнасці ад характару і цяжару ўчыненага злачынства крымінальнае праследаванне і абвінавачванне ў судзе ажыццяўляюцца ў публічным, прыватна-публічным парадку і ў парадку прыватнага абвінавачання.

У адпаведнасці з прынцыпам публічнасці крымінальнага працэсу, заснаваным на палажэннях шэрагу норм Канстытуцыі (артыкулы 2, 7, 21, 59, 137), дзяржава гарантуе кожнаму абарону ад злачынных замахаў; дзяржаўныя органы, службовыя асобы, упаўнаважаныя ажыццяўляць крымінальнае праследаванне, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры па выяўленні злачынстваў і выяўленні асоб, якія іх учынілі, узбуджэнні крымінальнай справы, прыцягненні вінаватых да прадугледжанай законам адказнасці і стварэнні ўмоў для пастановы судом законнага, абгрунтаванага і справядлівага прыгавору (артыкул 15 КПК).

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 26 снежня 2014 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении дополнений и изменений в Уголовный, Уголовно-процессуальный, Уголовно-исполнительный кодексы Республики Беларусь, Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях и Процессуально-исполнительный кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях» адзначана, што канстытуцыйны абавязак дзяржавы забяспечваць абарону правоў і свабод асобы, а значыць, і асобы, якая пацярпела ад злачынства, не азначае надзялення самога пацярпелага па справах публічнага абвінавачання правам прадвызначаць неабходнасць ажыццяўлення крымінальнага праследавання ў адносінах да пэўнай асобы. Такое права па ўказанай катэгорыі крымінальных спраў можа належаць толькі дзяржаве ў асобе яе органаў і службовых асоб, упаўнаважаных ажыццяўляць крымінальнае праследаванне.

Разам з тым крымінальна-працэсуальны закон дапускае ўключэнне ў крымінальны працэс элементаў дыспазітыўнасці: вырашэнне пытання як аб узбуджэнні крымінальных спраў прыватнага абвінавачання, так і аб спыненні вядзення па іх у сувязі з прымірэннем з абвінавачваным залежыць ад волевыяўлення асоб, якія пацярпелі ад злачынстваў. Пры гэтым заканадавец зыходзіць з таго, што такія злачынствы цесна звязаны з асобай пацярпеўшага і не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, іх раскрыццё, як правіла, не з'яўляецца складаным, у сувязі з чым асоба, якая пацярпела ад злачынства, здольна сама ажыццяўляць у парадку прыватнага абвінавачання крымінальнае праследаванне асобы, якая ўчыніла ў адносінах да яе адпаведнае злачынства.

Дадзенае заканадаўчае рэгуляванне абумоўлена неабходнасцю ўліку грамадскіх і прыватных інтарэсаў, якія закранаюцца ўказанымі ў частцы 2 артыкула 26 КПК злачынствамі, а таксама найбольш поўнага забеспячэння правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, у тым ліку прадугледжаных часткай першай артыкула 25, артыкуламі 28 і 29, часткай трэцяй артыкула 44 Канстытуцыі.

У Заключэнні Канстытуцыйнага Суда ад 12 чэрвеня 2014 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь пункта 7 части 1 статьи 29 и пункта 1 части 1 статьи 303 Уголовно-процессуального кодекса Республики Беларусь» выкладзена прававая пазіцыя, сутнасць якой заключаецца ў тым, што канстытуцыйнае права кожнага на абарону ад замаху на яго годнасць і гонар распаўсюджваецца не толькі на перыяд жыцця чалавека; гэта права абавязвае дзяржаву ўстанавіць прававыя гарантыі судовай абароны годнасці і гонару чалавека і пасля яго смерці.

Зыходзячы з выкладзенага, Канстытуцыйны Суд адзначае, што надзяленне асобы паўнамоцтвамі па ўзбуджэнні крымінальных спраў у парадку прыватнага абвінавачання і ажыццяўленні крымінальнага праследавання неабходна разглядаць у якасці дадатковай гарантыі абароны правоў і законных інтарэсаў асоб, якія пацярпелі ад злачынстваў, якая не вызваляе дзяржаву ад выканання канстытуцыйных функцый і абавязкаў па забеспячэнні законнасці і правапарадку, правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь як вышэйшай мэты дзяржавы, а таксама гарантаванні кожнаму судовай абароны яго правоў і свабод (частка трэцяя артыкула 1, частка першая артыкула 21, частка першая артыкула 60 Канстытуцыі). Так, згодна з КПК орган крымінальнага праследавання ў межах сваёй кампетэнцыі абавязаны ўзбудзіць крымінальную справу ў кожным выпадку выяўлення прымет злачынства, прыняць усе прадугледжаныя законам меры да ўстанаўлення прадугледжанага крымінальным законам калектыўна небяспечнага дзеяння, выкрыцця асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынства, і іх пакарання, роўна як прыняць меры па рэабілітацыі невінаватага, а таксама забяспечыць пацярпеламу доступ да правасуддзя і прыняць меры па забеспячэнні кампенсавання прычыненай шкоды (часткі 1 і 2 артыкула 27).

Аднак крымінальна-працэсуальны закон не змяшчае палажэнняў, што прадугледжвалі б узбуджэнне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання як пры адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, указанае ў частцы 2 артыкула 26 КПК, так і ў выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, што сведчыць, па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, аб прабеле канстытуцыйна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін, звязаных з ажыццяўленнем крымінальнага праследавання і разглядам спраў у судзе ў парадку прыватнага абвінавачання.

4. У адпаведнасці з Канстытуцыяй у Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права (частка першая артыкула 7); Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства (частка першая артыкула 8); забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы (частка першая артыкула 21); дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка першая артыкула 59).

Згодна з падпунктам «b» пункта 6 Дэкларацыі асноўных прынцыпаў правасуддзя для ахвяр злачынстваў і злоўжыванняў уладай (прынята 29 лістапада 1985 года рэзалюцыяй 40/34 Генеральнай Асамблеі ААН) неабходна садзейнічаць таму, каб судовыя і адміністрацыйныя працэдуры ў большай ступені адпавядалі патрэбнасцям ахвяр шляхам забеспячэння магчымасці выкладання і разгляду меркаванняў і пажаданняў ахвяр на адпаведных этапах судовага разбору ў тых выпадках, калі закранаюцца іх асабістыя інтарэсы, без шкоды для абвінавачваных і згодна з адпаведнай нацыянальнай сістэмай крымінальнага правасуддзя.

Канвенцыяй аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод ад 4 лістапада 1950 года замацавана права кожнага ў выпадку спрэчкі аб яго грамадзянскіх правах і абавязках або пры прад'яўленні яму любога крымінальнага абвінавачання на справядлівы і публічны разбор справы ў разумны тэрмін незалежным і непрадузятым судом (пункт 1 артыкула 6), а таксама права кожнага, чые правы і свабоды, прызнаныя ў дадзенай Канвенцыі, парушаны, на эфектыўны сродак прававой абароны ў дзяржаўным органе, нават калі гэта парушэнне было здзейснена асобамі, якія дзейнічалі ў афіцыйнай якасці (артыкул 13).

Прыведзеным палажэнням Канстытуцыі і міжнародна-прававых актаў адпавядае норма часткі 1 артыкула 7 КПК, у адпаведнасці з якой задачамі крымінальнага працэсу з'яўляюцца абарона асобы, яе правоў і свабод, інтарэсаў грамадства і дзяржавы шляхам хуткага і поўнага расследавання злачынстваў, выкрыцця і прыцягнення да крымінальнай адказнасці вінаватых; забеспячэнне правільнага прымянення закона з тым, каб кожны, хто ўчыніў злачынства, быў падвергнуты справядліваму пакаранню і ні адзін невінаваты не быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці і асуджаны.

У сувязі з выкладзеным Канстытуцыйны Суд мяркуе, што дзяржава абавязана забяспечыць доступ да правасуддзя кожнаму грамадзяніну, які пацярпеў ад злачынства, а ў выпадку смерці такой асобы гарантаваць судовую абарону яе годнасці і гонару.

Грунтуючыся на нормах Канстытуцыі аб тым, што дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства, а дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры дзеля стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка другая артыкула 7 і частка першая артыкула 59), Канстытуцыйны Суд лічыць неабходным устараніць прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачання шляхам унясення ў КПК змяненняў і дапаўненняў, што ўстанаўліваюць абавязак органа крымінальнага праследавання ўзбуджаць крымінальныя справы прыватнага абвінавачання ў выпадку адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, указанае ў частцы 2 артыкула 26 КПК, а таксама ўзбуджэнне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання ў выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, па заявах яе паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткамі першай і сёмай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22 і артыкулам 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, часткай другой артыкула 74, артыкуламі 75, 77, 80, 84, часткай сямнаццатай артыкула 85 і артыкулам 160 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве», Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

**ВЫРАШЫЎ:**

1. У мэтах выканання канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і законнасці, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону прызнаць неабходным устараніць прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачання шляхам унясення ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь змяненняў і дапаўненняў, што прадугледжваюць абавязак органа крымінальнага праследавання ўзбуджаць крымінальныя справы прыватнага абвінавачання пры адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла ўказанае ў частцы 2 артыкула 26 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса злачынства, а таксама ўзбуджэнне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання ў выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, па заявах яе паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць адпаведны праект закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь і ўнесці яго ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнне ўступае ў сілу з дня яго прыняцця.

4. Апублікаваць рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**
**П.П.МІКЛАШЭВІЧ**

*№ Р-1004/2015*

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**

220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 2 982 734 | 2 777 739 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 6 201 | 5 983 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 26 534 689 | 16 271 013 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 9 242 191 | 6 384 616 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 33 890 120 | 17 185 842 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 163 836 164 | 143 068 558 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 9 900 935 | 6 015 728 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 087 415 | 1 006 015 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 4 173 218 | 4 185 478 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 244 | 13 451 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 6 496 | 6 496 |
| 15 | Деловая репутация | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 1 659 363 | 962 908 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | 253 319 770 | 197 883 827 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | 3 377 283 | 5 436 046 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 39 667 227 | 28 745 240 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 156 599 925 | 124 502 793 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 16 866 918 | 13 386 052 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 24 705 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 6 052 | 6 052 |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 1 681 002 | 1 272 009 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | 218 198 407 | 173 372 897 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | 26 689 248 | 16 689 248 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | 1 942 808 | 1 258 313 |
| 31 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 2 123 372 | 2 119 287 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | 4 365 935 | 4 444 082 |
| 33 | ВСЕГО собственный капитал, принадлежащий головной организации | | 35 121 363 | 24 510 930 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 35 121 363 | 24 510 930 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 253 319 770 | 197 883 827 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 октября 2015 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 20 003 313 | 15 228 094 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 15 572 254 | 12 167 755 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 431 059 | 3 060 339 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 805 139 | 1 759 634 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 642 933 | 726 499 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 162 206 | 1 033 135 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4 683 | 1 884 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (65 846) | 2 969 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (1 720 812) | 86 569 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 3 866 811 | 647 905 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 380 813 | 232 928 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 451 441 | 668 467 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 3 897 662 | 3 345 316 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 618 657 | 523 797 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 232 410 | 1 399 227 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 210 520 | 158 946 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 021 890 | 1 240 281 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 1 021 890 | 1 240 281 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | 1 021 890 | 1 240 281 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | - | - |

Председатель Правления С.П.Писарик

Главный бухгалтер И.П.Лысоковская

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# БЕЛАРУСЬ — РАДЗІМА НОБЕЛЕЎСКІХ ЛАЎРЭАТАЎ



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 3.** Вёска на Астравеччыне, дзе жыў і працаваў над сваімі лепшымі творамі польскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі 1905 года Генрык Сянкевіч; яго маці — Стэфанія, паходзіла з беларускай (ліцвінскай) шляхты. **8.** Тое, што і бурштын. **9.** Горад на Беларусі, дзе нарадзіўся нобелеўскі лаўрэат Менахем Бегін, вядомы палітычны і грамадскі дзеяч Ізраіля. **10.** «І вось над хатай, над гуменцам, \\ Сняжынкі жвавыя гуляюць, \\ Садок і ... засцілаюць \\ Бялюткім чыстым палаценцам». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Зіма ў Парэччы»). **13.** Сухі снежань — сухая вясна, сухое ... *(прыкм.)*. **14.** Горад на Брэстчыне, малая радзіма бацькоў нобелеўскага лаўрэата, амерыканскага фізіка Марціна Перла. **15.** Музычны твор. **18.** Вечназялёны балотны зараснік з рэзкім пахам. **19.** Хваравітая цяга да чаго-небудзь *(перан.)*. **21.** Нізкі жаночы або дзіцячы голас. **22.** «У вайны не жаночае ...». Адна з кніг беларускай лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч; яе бацька быў добра знаёмы з Я. Коласам. **25.** Абрадавае беларускае пітво. **27.** Вышэйшая асоба Швецыі, якая зацвердзіла праект статута па Нобелеўскіх прэміях. **29.** ... Перскі. Сапраўднае імя і прозвішча Шымона Пераса, нобелеўскага лаўрэата, 9-га прэзідэнта Ізраіля, які нарадзіўся ў в. Вішнева, што на Валожыншчыне. **30.** Імя бацькі расійскага нобелеўскага лаўрэата Ільі Прыгожына, які нарадзіўся ў Магілёве. **31.** Дзень тыдня, які лічыўся адным з найбольш спрыяльных для пачатку розных спраў.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Змітрок ... . Беларускі пісьменнік, які, як і Янка Купала, быў добра знаёмы з маці расійскага фізіка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, ураджэнца г. Віцебска Жарэса Алфёрава Ганнай Уладзіміраўнай, ураджэнкай в. Крайск, што на Лагойшчыне. Бацька лаўрэата — Іван Карпавіч, нарадзіўся ў г. Чашнікі. 2. «Мароз, як ... бязжаласны, \\ У лёд рэчкі закаваў». З верша Я. Купалы «Зіма». **4.** Адвар з ягад, траў. **5.** Ахоўная абалонка, у якой вусень ператвараецца ў кукалку. **6.** Н'ю-... . Буйны амерыканскі горад, дзе нарадзіўся амерыканскі фізік, адзін са стваральнікаў атамнай бомбы Рычард Фейнман, бацька якога — ураджэнец г. Мінска. **7.** Асоба, якая праводзіць пасяджэнне. **11.** Сталіца Швецыі, дзе штогод, 10 снежня, адбываецца ўрачыстае ўзнагароджванне новых нобелеўскіх лаўрэатаў. **12.** Кожная пазіцыя пры прысуджэнні ганаровага звання або прызоў. **16.** Горад на Брэстчыне, дзе нарадзіўся амерыканскі эканаміст, нобелеўскі лаўрэат Саймон Кузнец; у гэтым жа горадзе і радавыя карані амерыканскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата Фрэдэрыка Райнеса. **17.** Іцхак ... . Прозвішча нобелеўскага лаўрэата, дзяржаўнага дзеяча Ізраіля, які нарадзіўся ў г.п. Ружаны, што на Брэстчыне. **18.** «Мая родная ...». Назва раздзела з кнігі Ж. Алфёрава «Навука і грамадства». **20.** Аранжава-чырвоныя ягады, якімі ўзімку любяць ласавацца снегіры. **23.** Васіль ... . Народны пісьменнік Беларусі, які аказаў вялікі ўплыў на творчасць С. Алексіевіч. **24.** У мусульман мужчынскі галаўны ўбор. **26.** Тое, што і доля. **28.** На святы Сцяпан кожны парабак сабе ... *(прык.)*; прысвятак Сцяпан адзначаўся 30 снежня.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** 3. Дубнікі. 8. Янтар. 9. Брэст. 10. Дварык. 13. Лета. 14. Пружаны. 15. Марш. 18. Багун. 19. Манія. 21. Альт. 22. Аблічча. 25. Сыта. 27. Кароль. 29. Сямён. 30. Раман. 31. Аўторак. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Бядуля. 2. Кат. 4. Узвар. 5. Кокан. 6. Ёрк. 7. Старшыня. 11. Стакгольм. 12. Намінацыя. 16. Пінск. 17. Шамір. 18. Беларусь. 20. Рабіна. 23. Быкаў. 24. Чалма. 26. Лёс. 28. Пан.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.16 | 16.48 | 7.32 |
| Віцебск — | 9.13 | 16.30 | 7.17 |
| Магілёў — | 9.07 | 16.38 | 7.31 |
| Гомель — | 8.55 | 16.43 | 7.48 |
| Гродна — | 9.30 | 17.04 | 7.34 |
| Брэст — | 9.23 | 17.13 | 7.50 |

**Месяц**

***Маладзік 11 снежня.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксея, Барыса, Васіля, Захара, Івана, Мікалая, Рамана, Сяргея.* ***К.*** *Марыі, Юліі, Андрэя, Даніэля, Рыгора.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**10 СНЕЖНЯ**

**1574** год — нарадзіўся Мікалай Лянчыцкі, дзеяч беларускай культуры першай паловы XVII ст. Прафесар Віленскага ўніверсітэта, выкладаў у Нясвіжскім калегіуме, навучальных установах Польшчы, Літвы і Чэхіі. Займаючы высокія пасады ў адміністрацыі Каталіцкай Царквы, выступаў як прыхільнік рэлігійнай памяркоўнасці, змагаўся за аб'яднанне навучальных устаноў розных канфесій. Свае сачыненні прысвяціў пытанням маральна-рэлігійнага характару, пра што сведчаць назвы: «Аб правільна пражытым юнацтве», «Аб кіраванні чалавечымі страсцямі», «Аб праведнай любові да Бога». Памёр у 1653 годзе.

**1870** год — 145 гадоў таму нарадзіўся (былы маёнтак Багданаў, цяпер — Валожынскі раён) Фердынанд Рушчыц, жывапісец, графік, тэатральны мастак і педагог. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы і Літвы. Вучыўся ў К. Ермалаева ў Мінску, у 1897 годзе скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. У 1904—1907 гадах — прафесар Школы прыгожых мастацтваў у Варшаве, Кракаўскай акадэміі мастацтваў (1907-1908), аддзялення прыгожых мастацтваў Віленскага ўніверсітэта. Творчасці ранняга перыяду ўласцівы рэалістычны малюнак роднай прыроды. Зазнаў уплыў імпрэсіянізму і стылю «мадэрн». Сярод карцін: «Мінск зімой», «Млын ноччу», «Па свеце», «Зямля» і інш. Працаваў таксама ў графіцы: выконваў ілюстрацыі да перыядычных выданняў Вільні, Варшавы, Кракава. Аўтар станковых работ «Сям'я», «Аўтапартрэт», «Дрэвы над вадой» і інш. Аформіў шэраг спектакляў у тэатры Н. Младзееўскай-Шчуркевіч у Вільні. Памёр у 1936 годзе.



**1948** год — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека. Дакумент абвяшчае правы асобы, грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды (роўнасць усіх перад законам, права кожнага на свабоду і асабістую недатыкальнасць, свабоду сумлення і іншыя). Праз два гады, у 1950-м, гэты дзень быў абвешчаны як Дзень правоў чалавека. Дэкларацыя стала першым універсальным дакументам па правах чалавека. Многія краіны ўключаюць асноўныя яго палажэнні ў свае базавае заканадаўства і канстытуцыі. Яго прынцыпы ляжаць у аснове шматлікіх пактаў, канвенцый і дагавораў. Гэты дакумент быў перакладзены больш як на 350 моў свету. Элеанора Рузвельт назвала Дэкларацыю «Вялікай хартыяй вольнасцяў» для ўсяго чалавецтва (таму яе часам называюць Хартыяй правоў чалавека). Найбольш шырокія абавязковыя пагадненні па правах чалавека, заключаныя пад эгідай ААН, — гэта падпісаныя 16 снежня 1966 года Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах.

**Было сказана**

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:**
*«З горнай вяршыні не сходзіць туман,*
*З вернага сэрца — любоў».*

## ЧАМАДАН З РТУЦЦЮ

**У сталіцы быў знойдзены пакінуты без нагляду чамадан з рэчывам, падобным да ртуці.**

Адбылося гэта каля аднаго з дамоў па вуліцы Першамайскай. У чамадане былі дзве ёмістасці для перавозкі вадкіх цяжкіх металаў, у прыватнасці ртуці. Яны былі запоўненыя. Знаходку перадалі супрацоўнікам МНС для даследавання змесціва, праваахоўныя органы праводзяць праверку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі прусакі здольны перажыць атамную вайну, то з чаго робяць крэйду «Машачка»?**

— А ты даўно кактус на халадзільніку палівaў?
— Гэта хлеб.

**Да жанчыны яго мары яна крыху недамаўчала...**

Настаўнік пытаецца вучаніцу дзясятага класа:
— Паліна, назаві будучы час дзеяслова «кахаць».
— Выйсці замуж.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4952.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2015 года.